КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 10 (186)
◂ 19 САКАВІКА ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час




**ЯЗЫК МОЙ — ВОРАГ МОЙ**
Стар. 3

**SMS-ДЗЁННІК З МІНУЛАГА СТАГОДДЗЯ**
Не горад і не вёска. Мястэчка — полікультурны мікракосмас, які Беларусь страціла на пачатку мінулага стагоддзя
Стар. 5

**ГАІЦІ: БЫЛО ДРЭННА, СТАЛА ЯШЧЭ ГОРШ**
Рэпартаж Алега Новікава з пацярпелай краіны
Стар. 12 –13

**АЙЧЫНА. НАВУКА. СУМЛЕННЕ**
Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Глеб Лабадзенка.**
**АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ СЛУЖБА БЕЛАРУСІ**

Нарыс Марыі Мартысевіч з цыклу «Новая генерацыя»

▸ АД РЭДАКТАРА

# СЕЗОН ПАЛЯВАННЯ НА ЖУРНАЛІСТАЎ

Аляксей КАРОЛЬ

**16 сакавіка 2010 азначана брутальнымі акцыямі мінскіх «сілавікоў» супраць незалежных журналістаў. Залпам. Па загадзя вызначаных аб’ектах.**


Photo.ByMedia.Net

Прыкладна з 15.00 да 20.00 ператрус і вобыск зведалі офісы і (ці) прыватныя кватэры рэдактара інтэрнэт-рэсурса «Хартыя–97» Наталлі Радзінай, журналісткі Ірыны Халіп, лідэра грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Андрэя Саннікава, шэф-рэдактара газеты «Народная воля» Святланы Калінкінай, намесніцы галоўнага рэдактара «Народнай волі» Марыны Коктыш. Канфіскаваны сістэмныя блокі кампутараў і электронныя носьбіты інфармацыі.

Самі па сабе гэтыя акцыі — не навіна, а, можна сказаць, руцінная практыка рэжыму ў адносінах да незалежных СМІ. Мне з калегамі па газеце «Згода», зачыненай напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2006 года, давялося перажыць некалькі такіх уварванняў на офіс і прыватную кватэру, канфіскацый, судоў і прысудаў. Падобны спіс «узнагарод» мае ў сваім актыве ці не кожнае незалежнае выданне. З тых лічаных, што здолелі выстаяць.

Але ёсць і новыя нюансы. Упершыню вобыскі праводзіліся нібыта ў сувязі з іншай справай і з санкцыі абласной пракуратуры. Дзеля пошуку дадатковай інфармацыі, якая можа ўтрымлівацца на кампутарах журналістаў. У дадзеным выпадку, у сувязі з так званай «паляўнічай справай», у аснове якой — канфлікт паміж сілавымі структурамі ў Гомельскай вобласці. Раней уварванні ў рэдакцыі грунтаваліся на абвінавачванні непасрэдна СМІ ў паклёпе, абразе гонару і годнасці высокіх службовых асоб.

Не навіна і выбар уладнай групоўкай асоб для атакі: па крытэру іх актыўнасці і патэнцыйна магчымых палітычных наступстваў ад іх дзейнасці. Зыходзячы, зразумела, з уласнага ўяўлення пра сітуацыю. Як заўсёды, перабольшанага з-за сваіх страхаў страты ўлады.

Кожная з журналістак, што трапіла пад пераслед, — таленавітая ў сваёй прафесіі, мае высокі давер у чытачоў, вызначылася смелымі і вострымі публікацыямі. За кожнай з іх стаіць, у працяг траекторыі рэпрэсій, папулярныя і ўплывовыя выданні — сайты «Хартыя–97», «Беларускі партызан», газета «Народная воля».

Гэта аперацыя не ёсць спантанная, ці абсалютна самастойна спланаваная сілавымі структурамі, ці выключна вынікаючая з іх унутранай барацьбы — паміж КДБ і МУС. Ва ўсялякім разе, гэта не галоўны яе элемент. Санкцыю на ўсе ператрусы давала гомельская пракуратура. Але ўсе яны праводзіліся ў Мінску, сталічнымі ж міліцыянтамі, а яшчэ верагодней, у хаўрусе з прадстаўнікамі КДБ. Усе ж — у цывільным. Хто ёсць хто — не разбярэш. Калісьці ператрусам у рэдакцыі «Згода» кіраваў менавіта супрацоўнік КДБ, і нават гэта не хаваў.

Акцыя вясенняга «палявання» на журналістаў спакваля рыхтавалася і пакрокава ажыццяўлялася. Узгадаем хаця б затрыманні і прысуды на суткі Андрэю Пачобуту і Івану Шульгу, перашкоды журналістам у іх прафесійнай працы падчас вулічных акцый, папярэджанне БАЖ, пераслед, з прыцягненнем пад суд, фотакарэспандэнта «Нашай нівы» Юлі Дарашкевіч. Урэшце — першыя вобшукі ў лютым на працоўных месцах Марыны Коктыш і Святланы Калінкінай, допыт у міліцыі 3 сакавіка Ірыны Халіп і Андрэя Саннікава.

У пацвярджэнне таму і канкрэтныя даты. Як праінфармавала на прэсавай канферэнцыі Марына Коктыш, падчас другога вобыску яна даведалася, што яшчэ 31 снежня 2009 года была распачата справа па факце публікацый артыкулаў на тэму гомельскай «паляўнічай справы» ў шэрагу СМІ. Пастанова на вобыск была падпісана 23 лютага 2010 года. Значыць, на выбар канкрэтнага моманту, на канчатковы сігнал для атакі, на падрыхтоўчыя крокі спатрэбілася яшчэ некалькі тыдняў.

З якога ж тады цеста вырасла і дзеля чаго была праведзена гэта яўна дэманстрацыйная аперацыя ператрусаў у рэдакцыях і кватэрах незалежных журналістаў, прычым без бачных пагроз існуючай уладзе знутры? Наадварот, з відавочнай пагрозай атрымаць з боку ЕС у адказ на такія рэпрэсіўныя дзеянні адмову ў новых крэдытах у сукупнасці з магчымым аднаўленнем санкцый.

Зыходная прычына відавочна абумоўлена прэзідэнцкім цыклам. Зачыстка перадвыбарчага поля ад найбольш небяспечных апанентаў. Якімі гэтым разам кіруючай групоўцы бачацца не партыі, не кандыдаты ў прэзідэнты (гэтыя сегменты аслаблены раней), а менавіта незалежныя СМІ. І адначасова гэта прызнанне, што ўлада адчула такія змены ў настроях грамадства, якія, як ёй падаецца, могуць у пэўны момант абярнуцца сацыяльным выбухам. Пад уздзеяннем праўдзівай інфармацыі. Падзеі пачатку 1990-х — страшным прывідам у падсвядомасці.

Вясновае абвастрэнне «палявання» на журналістаў аб’ектыўна скіравана на паглыбленне расколу грамадства на сваіх і ворагаў. Бо гэты падзел ёсць культавая рыса аўтарытарнай улады, тым больш адбудаванай па матрыцы савецкай таталітарнай мадэлі. Гэта ўлада не здольная функцыянаваць на прынцыпах дэмакратычнага прымірэння інтарэсаў.

Што ж тычыцца крыніц рэсурсаў, то іх у таталітарных і аўтарытарных рэжымаў усяго тры. Знешняя — праз вайну ці праз атрыманне крэдытаў у абмен на палітычную залежнасць. І дзве ўнутраныя крыніцы — прыродная і сацыяльная. Калі адсутнічаюць знешні і прыродны фактары, такія рэжымы пераключаецца на сацыяльны, гэта значыць, зніжаючы да жабрацтва матэрыяльны ўзровень існавання большасці насельніцтва. Замест сацыяльнага кантракта — сацыяльны бізун.

Пагрозы сацыяльнага выбуху, якія пры гэтым узнікаюць, нейтралізуюцца праз прапаганду, сілавымі метадамі, праз самаізаляцыю краіны. Не выключаны і гандаль суверэнітэтам. А гэта ўсё вымагае максімальнай зачысткі інфармацыйнага поля ад свабоднага слова.

Аднак гісторыя сведчыць: калі ў грамадстве сабралася крытычная маса для перамен, усе гэтыя высілкі — дарэмныя.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### САЛІГОРСК. ПАМЯЦІ ЯНЫ ПАЛЯКОВАЙ

Год таму трагічна сышла з жыцця праваабаронца Яна Палякова. Рэжысёр Вольга Мікалайчык прысвяціла яе светлай памяці фільм, які назвала «Смерць напярэдадні вясны». У ім даследуюцца прычыны гібелі Яны. Прэм'ера адбылася на сядзібе БНФ у Салігорску. У ёй удзельнічалі сама Вольга Мікалайчык, дзеячы культуры, палітыкі, праваабаронцы.

### ЖЫТКАВІЧЫ. ВЫЗНАЧАНА ЛЕПШАЯ СЯДЗІБА

На міжнароднай спецыялізаванай канферэнцыі «Аграэкатурызм — стан і перспектывы развіцця», арганізаванай і праведзенай Белаграпрабанкам і Беларускім грамадскім аб'яднаннем «Адпачынак у вёсцы», былі падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу «Лепшыя сядзібы года». У намінацыі «Захаванне беларускіх традыцый» сярод пераможцаў сядзіба «Страчаны рай» Аляксандра Масло ў Жыткавіцкім раёне.

### ЛОЕЎ. НА ЯПОНСКІЯ ГРОШЫ

Алена Пінчук, галоўны ўрач УАЗ «Лоеўская цэнтральная раённая бальніца», і Мацудзакі Кіёсі, часовы паверааны ў справах Японіі ў Рэспубліцы Беларусь, падпісалі кантракт на атрыманне гранта ў рамках рэалізацыі праграмы ўрада Японіі «Грантавая дапамога для праектаў па бяспечнасці насельніцтва». Японія ў чарговы раз акажа грашовую дапамогу на набыццё сучаснага медыцынскага абсталявання для палаты рэанімацыі бальніцы на суму 96,5 тысячы долараў. На цырымоніі падпісання дамовы прысутнічалі прадстаўнікі мясцовай улады, аташэ Амбасады Японіі ў РБ Ханда Міха, і каардынатар гуманітарных праектаў амбасады Японіі ў РБ С. Шчогалеў.

### СВЕТЛАГОРСК. НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ЖАНЧЫН

У карцінная галерэі «Традыцыя» адчынілася персанальная выстава вядомага скульптара, мастака і фатографа Аляксандра Камардзіна з нагоды яго юбілею. Экспазіцыя разнастайная, ва ўсіх жанрах, у якіх працуе творца. Камардзін — сябра Саюза мастакоў Беларусі, удзельнік шматлікіх выстаў і пленэраў. У сваёй творчасці найбольш увагі надзяляе вобразу жанчын. Таму на адкрыцці выставы сярод наведвальнікаў іх была большасць.

### БАБРУЙСК. СЫН ПРЫСВЯЦІЎ ВЫСТАВУ БАЦЬКУ

У мастацкім музеі імя Георгія Паплаўскага адкрылася персанальная выстава мастака Сямёна Дамарада «Час памяці», прысвечаная бацьку — таленавітаму мастаку, летапісцу пасляваеннага горада Уладзіміру Дамараду. У экспазіцыі каля 70 карцінаў — пейзажы Бабруйска і ваколіц.

### БАРАНАВІЧЫ. УЛАСНАГА РАЗЛІВУ КУПП

КУПП «Пескаўскае» — адзіная з гарэлачных вытворцаў займела ліцэнзію на разліў каньяку. У гэтым годзе яму дадзена квота на вытворчасць 20 тысяч дэкалітраў гэтага напітку. Зараз спецыялісты прадпрыемства працуюць над арыгінальнай аздобай пляшкі, корка і этыкеткі будучага прадукту.

### АСТРАВЕЦ. ПА АБОДВА БАКІ МЯЖЫ

У Літве пад петыцыяй, размешчанай на сайце www.e-peticija.lt, праходзіць збор подпісаў супраць будаўніцтва беларускай АЭС «пад бокам у Вільні». Будаўнічая пляцоўка будучай АЭС знаходзіцца ў 23 кіламетрах ад мяжы з Літвой, адзначаюць аўтары звароту. Петыцыя была апублікавана 5 сакавіка, за гэты час падпісалася 6000 чалавек. У петыцыі адзначаецца, што на новай АЭС будзе ўсталяваны расійскі рэактар AES-2006, які дагэтуль нідзе не выкарыстоўваўся, а ў выпадку аварыі Вільня апынецца ў зоне эвакуацыі. «Паспяшаемся. Мы павінны сабраць подпісы да 31 сакавіка», — заклікаюць ініцыятары збору подпісаў, матывуючы гэта тым, што пры падрыхтоўцы пазіцыі Літвы будзе ўлічана і меркаванне грамадскасці, цытуе зварот www.delfi.lt.

Мясцовыя экалагі ў вялікай ступені выказваюць спадзяванні на міжнародны рэзананс, выкліканы атамнымі планамі беларускай улады. Літоўцы, якім беларуская АЭС можа прынесці не толькі крыніцу імпарту электраэнергіі, але і магчымыя экалагічныя небяспекі, ужо не маўчаць.

СУД

## БАЖ СУПРАЦЬ МІНЮСТА

**17 сакавіка ў Вярхоўным судзе пачаўся разгляд скаргі ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» на папярэджанне Міністэрства юстыцыі.**

Справу вядзе суддзя Анатоль Церах. Інтарэсы ГА «БАЖ» прадстаўляюць старшыня арганізацыі Жанна Літвіна і яе намеснік, юрыст Андрэй Бастунец. Суддзя задаволіў хадайніцтва аб допуску да працэсу ў якасці прадстаўніка грамадскасці намесніка старшыні РГА «Беларускі Хельсінскі Камітэт» Гары Паганяйлы.

Мінюст прадстаўляе кансультант Упраўлення грамадскіх аб'яднанняў Аляксандр Харытон. На пасяджэнні таксама прысутнічае прадстаўніца Генеральнай пракуратуры пракурор Скарабагатая.

Яшчэ перад пачаткам пасяджэння суддзя папярэдзіў, што рашэнне суда па гэтай справе не зможа быць абскарджана. Пры гэтым ён спаслаўся на Грамадзянскі працэсуальны кодэкс (ГПК).

Гэта выклікала пратэст Гары Паганяйлы. У сваім выступе ён падкрэсліў, што згаданая норма ГПК не адпавядае Канстытуцыі і арт. 14 ратыфікаванага Беларуссю «Акту аб грамадзянскіх і палітычных правах». «Гэтыя нарматыўныя акты маюць большую моц, чым нормы ГПК, і яны гарантуюць кожнаму права на абскарджанне судовых рашэнняў», — заявіў Г. Паганяйла.

Суддзя забараніў весці ў зале суда не толькі фота- і відэаздымкі, але і аўдыёзапіс. Дыктафонамі дазволілі карыстацца толькі ўдзельнікам працэсу.

Суд задаволіў хадайніцтва БАЖ аб далучэнні да матэрыялаў справы копій сяброўскіх пасведчанняў журналісцкіх саюзаў Германіі, Даніі, Расіі, а таксама Міжнароднай федэрацыі журналістаў, на якіх ёсць слова «прэса». Прадстаўнік Міністэрства юстыцыі «не бачыў сэнсу» ў далучэнні іх да справы, але пракурор не пярэчыла, і суддзя задаволіў хадайніцтва.

**Нагадаем:**

Загад намесніка міністра юстыцыі аб вынясенні ГА «БАЖ» пісьмовага папярэджання з'явіўся 13 студзеня. Міністэрства выставіла адразу некалькі прэтэнзій да ГА «БАЖ» — датычна формы сяброўскага пасведчання, статусу Цэнтра прававой абароны СМІ пры ГА «БАЖ», а таксама некаторай інфармацыі, пададзенай на сайце baj.by.

11 лютага ГА «БАЖ» накіравала ў Вярхоўны суд скаргу на папярэджанне.

**Паводле інфармацыі БАЖ**

СМІ

## ЗАБАРОНА НА ПРАФЕСІЮ

**Сябра ГА «БАЖ» Аляксандра Дзянісава аштрафавалі на 2 базавыя велічыні (70 тысяч рублёў). Такое рашэнне прыняў суд Ленінскага раёна Гродна 15 сакавіка. Суддзя Ксенія Стасюкевіч палічыла, што Аляксандр Дзянісаў займаўся журналісцкай дзейнасцю, не маючы на тое адпаведнага дазволу, чым парушыў артыкул 23.39 КаАП РБ «Самаўпраўства».**

У сваю чаргу, адвакат Уладзімір Кісялевіч, які прадстаўляў інтарэсы журналіста ў судзе, пераканаыны, што правапарушэння журналіст не здзяйсняў, бо кожны грамадзянін краіны паводле Канстытуцыі мае права на атрыманне інфармацыі: «Атрымліваецца, што чалавек, які не з'яўляецца сябрам Саюза пісьменнікаў, не мае права пісаць творы, бо гэта таксама «самаўпраўства»?»

На думку адваката, уся сітуацыя з затрыманнем Дзянісава скіраваная на падрыхтоўку да суда аб папярэджанні ГА «БАЖ», сябрам якога ён з'яўляецца. Паводле Уладзіміра Кісялевіча, у матэрыялах справы Дзянісава фігуруе ліст з Міністэрства юстыцыі, якое патрабуе неадкладна даслаць копію рашэння па справе ў дзяржаўную ўстанову.

Менавіта інцыдэнт з яго затрыманнем у лістападзе 2009 года на шклозаводзе «Нёман» пры «ажыццяўленні відэарэпартажу» даў грунт для аднаго з пунктаў папярэджання. Прад'яўленае ім пасведчанне сябра БАЖ прывяло Міністэрства юстыцыі да высновы пра «неабгрунтаванае прысваенне сябрамі дадзенай арганізацыі паўнамоцтваў журналіста сродку масавай інфармацыі…».

Сам Аляксандр Дзянісаў разглядае свой сённяшні прысуд у рэчышчы мэтанакіраванага абмежавання канстытуцыйнага права грамадзян на атрыманне і распаўсюд інфармацыі.

18 студзеня 2010 года ў Гродзенскай сярэдняй школе № 28 Аляксандр Дзянісаў рыхтаваў тэлесюжэт пра факультатыўнае вывучэнне «Гродназнаўства». Тады ў клас, дзе праходзіў урок і дзе знаходзілася здымачная група разам з А. Дзянісавым, уварваліся міліцыянты і абвясцілі, што журналісты падазраюцца ў здзяйсненні злачынстваў. На гэтай падставе іх затрымалі, але праз пэўны час адпусцілі. А 22 лютага старшы лейтэнант Ленінскага РАУС Гродна Пётр Друць склаў у дачыненні да Дзянісава пратакол, у якім гаварылася, што ён «займаўся журналісцкай дзейнасцю (браў інтэрв'ю ў намесніка дырэктара школы Шабунькі Т.І. і настаўніка Рабкова А.С.), не маючы на тое спецыяльнага права і не з'яўляючыся журналістам».

**Паводле інфармацыі БАЖ**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ПАХОД У ВЕЧНАСЦЬ

Любоў ПРАНЕВІЧ

**16 сакавіка ў Брэсце развіталіся з чатырма турыстамі, якія 8 сакавіка загінулі пад снежнай лавінай у гарах Мурманскай вобласці.**

Грамадзянская паніхіда адбылася ў Лядовым палацы: сотні людзей, сярод якіх родныя і сябры памерлых, а таксама прадстаўнікі мясцовай улады, прыйшлі правесці Міхаіла Карпеша, Дар'ю Трацінскую, Яўгена Траскевіча і Аляксандру Коўган у апошні шлях. Адпявалі загінулых у саборы Святога Уваскрашэння, затым іх целы перавезлі да месцаў пахавання. Напярэдадні яны былі дастаўленыя ў спецыяльным вагоне хуткага цягніка Мінск–Брэст. З ім таксама прыбылі бацькі Дар'і Трацінскай і два ўдзельнікі паходу, якія выратаваліся, — Аляксандр Юрага і Дзмітрый Фамін.

У паход трэцяй катэгорыі складанасці група пешых турыстаў з 6 чалавек выйшла 3 сакавіка. Маршрут праходзіў па Лавазерскаму раёну Мурманскай вобласці.

Трагедыя здарылася 8 сакавіка, калі на перавале Паўночны Таваёк абрынулася снежная лавіна, якая накрыла ўдзельнікаў групы. Аляксандр Юрага і Дзмітрый Фамін замыкалі калону, лавіна іх не закранула. Пасля безвыніковых спробаў знайсці ў снезе і адкапаць сяброў, яны вярнуліся да намёта, дзе правялі ноч, на наступны дзень рушылі па дапамогу. Да бліжэйшага населенага пункта было 26 кіламетраў. Дабраліся яны туды толькі 9 сакавіка ўвечары. Назад прыбылі разам з супрацоўнікамі МНС у 22 гадзіны. Плошча пошукаў на месцы сыходу лавіны складала 70 метраў удаўжыню, 30 метраў ушырыню і 3 метры ўглыбіню. Пры гэтым эфектыўна весці пошукавыя працы можна было толькі ўдзень. 11 сакавіка ўдалося знайсці і дастаць з-пад завалаў целы загінулых.

«Яны патрапілі пад вельмі жорсткую лавіну. Снегу было вельмі многа, ён вельмі цяжкі, як бетонны раствор. Верагодна, яны загінулі ў першыя хвіліны. Мы спадзяваліся на цуд: што іх вынесе, што заваліць буралом, і яны застануцца жывымі…» — кажа Юрый Кожухаў, кіраўнік альпіністкага клубу «Рубеж».

12 сакавіка з ініцыятывы брэсцкіх турыстаў быў адкрыты дабрачынны рахунак для аказання дапамогі родным загінулых у Мурманскай вобласці: разліковы рахунак № 3819382105438 у філіяле № 126 ААТ «ААБ «Беларусбанк» горада Брэста, МФА 252, дабрачынны рахунак № 000 000 030 з паметкай «На аказанне дапамогі родным турыстаў, якія трапілі ў катастрофу ў гарах Кольскага паўвострава».

АКЦЫЯ

## ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ

**15 сакавіка актывісты незарэгістраванай арганізацыі «Вольная моладзь» адзначылі Дзень Канстытуцыі, прынятай у 1994 годзе.**

Актывісты вывесілі некалькі расцяжак з надпісам «Паважайце канстытуцыю». У тым ліку на мосце каля універмага «Беларусь», насупраць адміністрацыі Заводскага раёна Мінска.

Па словах адной з актывістак арганізацыі «Вольная моладзь» Вікторыі Ладзіс, мэтай акцыі было «прыцягнуць увагу грамадскасці, што ў сённяшніх умовах не дзейнічаюць не толькі агульнаеўрапейскія прававыя нормы, але нават цяперашняя беларуская канстытуцыя».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЯЗЫК МОЙ — ВОРАГ МОЙ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Іншым разам лепш жаваць, чым гаварыць. Менавіта гэта рэкламная фраза найбольш пасуе да выступоўцаў — пацярпелых на працэсе Аўтуховіча. Здаецца, што «пацярпелыя» нагаварылі сабе на канкрэтныя турэмныя тэрміны.**


Фота Юлі Дарашкевіч




Нагадаем, што падсуднымі па справе з'яўляюцца чатыры чалавекі: Мікалай Аўтуховіч, Уладзімір Асіпенка, Аляксандр Ларын і Міхаіл Казлоў. Першых трох абвінавачваюць у падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта ў дачыненні да двух чыноўнікаў — намесніка міністра па падатках і зборах Беларусі Васіля Камянко і былога губернатара Гродзенскай вобласці Уладзіміра Саўчанкі.

Аўтуховіч і Асіпенка таксама абвінавачваюцца ў арганізацыі падпалу дома былога начальніка Ваўкавыскага РАУС Віталя Кацубы ў 2004 годзе.

Як заявіў у судзе прадстаўнік абвінавачвання пракурор Эльдар Сафараў, Ларын паводле ўказання Аўтуховіча і Асіпенкі набыў агнястрэльную зброю, электрашокеры, тратылавыя шашкі і радыёцацкі, дэталі якіх планавалася выкарыстоўваць для стварэння выбуховага прыстасавання.

Міхаіл Казлоў, падпалкоўнік міліцыі, былы кіраўнік УБАЗ па Гродзенскай вобласці, абвінавачваецца ў тым, што ведаў пра планы падрыхтоўкі тэрарыстычнага акта, але не зрабіў захадаў для яго прадухілення.

Аўтуховіч, Асіпенка і Казлоў сваю віну не прызналі ў поўным аб'ёме. Ларын прызнаў сваю віну часткова. Падчас судовага пасяджэння ён паведаміў, што сапраўды захоўваў і перавозіў боеприпасы і выбуховыя рэчывы.

Ларын таксама прызнаўся ў падрыхтоўцы да тэрарыстычнага акта. Калі суддзя заўважыў, што такія прызнанні з'яўляюцца поўным прызнаннем віны, Ларын заявіў, што яму патрабуецца час для таго, каб асэнсаваць сваю пазіцыю.

Але больш цікавымі з'яўляюцца паказанні Сяргея Кацубы і Васіля Камянко. Кацуба ў судзе паведаміў, што калісьці па тэлефанаванню свайго кіраўніцтва з Гродна спыняў і канфіскоўваў машыны — таксоўкі фірмы Аўтуховіча. Але ж выкананне такога загаду наўрад ці законнае: канфіскацыя маёмасці праходзіць не па тэлефанаванні, а па рашэнню суда, чаго ў Кацубы на руках не было. А Васіль Камянко, даўшы падпіску пра адказнасць за дачу ілжывых паказанняў, заявіў у судзе: «Хутчэй за ўсё, я кажу праўду».

Хутчэй за ўсё, і Кацубу, і Камянко трэба азнаёміцца з Крымінальным кодэксам, паколькі іх паказанні зафіксаваныя ў пратаколе судовага пасяджэння. І гэтыя пратаколы ў судзе будуць захоўвацца вельмі доўга.

На тыдні здарылася другая частка марлезонскага балета. Журналісты яшчэ не забыліся на маштабныяператрусы, што прайшлі ў журналістаў «Белсату», «Еўрапейскага радыё ў Беларусі», «Радыё Рацыя» ў 2008 годзе. Зараз гісторыя паўтарылася.

16 сакавіка ў Мінску прайшлі вобшукі ў незалежных журналістаў. Супрацоўнікі міліцыі і людзі ў цывільным правялі вобшукі ў офісе сайта charter97.org, рэдакцыі газеты «Народная воля», а таксама ў кватэры журналісткі Ірыны Халіп і яе мужа, лідэра грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Андрэя Саннікава.

Гэта ўжо другая хваляператрусаў у сувязі з так званай «паляўнічай справай». У лютым ужо праводзіліся вобшукі ў журналістаў «Народнай волі» Марыны Коктыш і Святланы Калінкінай. А Ірына Халіп і Андрэй Саннікаў 3 сакавіка былі дапытаныя ў УУС Партызанскага раёна Мінска.

У пачатку сакавіка Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ) накіравала ліст генпракурору Рыгору Васілевічу, у якім заявіла пра незаконнасць дзеянняў супрацоўнікаў міліцыі. «Гэтыя вобшукі нагадалі падзеі двухгадовай даўніны, калі вобшукі — і таксама па прычыне расследавання крымінальнай справы аб паклёпе і абразе, але прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, — прайшлі ў кватэрах журналістаў па ўсёй Беларусі. Як і зараз, тады ў пастановах аб правядзенні вобшуку не прыводзілася ніякіх канкрэтных падстаў, акрамя спасылкі на тое, што ў месцах вобшукаў нібыта «могуць знаходзіцца якія-небудзь прадметы, што могуць мець значэнне для справы». Як і зараз, асобы, у якіх рабіліся вобшукі, не з'яўляліся падазронымі ці абвінавачанымі па справе. Як і зараз, у грамадскасці былі ўсе падставы меркаваць, што сапраўднай мэтай вобшукаў з'яўляецца перашкода журналісцкай дзейнасці і запалохванне журналістаў», — гаварылася ў лісце.

Як паведаміў намеснік старшыні БАЖ Андрэй Бастунец, на днях Генпракуратура паведаміла асацыяцыі, што ліст накіраваны ў Гомельскую вобласць на рэагаванне мясцовай пракуратуры, якая і санкцыянавала ўсе гэтыя вобшукі. «Але замест адэкватнага рэагавання мы бачым новую хвалю вобшукаў», — канстатаваў Бастунец.

Андрэй Саннікаў 17 сакавіка на прэс-канферэнцыі, арганізаванай у сувязі з праведзенымі напярэдадні вобшукамі ў незалежных журналістаў, заявіў: Еўрасаюз павінен прызнаць, што незалежных судоў і свабоды прэсы ў Беларусі не існуе. Акрамя таго, лічыць Саннікаў, «Еўрасаюз павінен прызнаць паразу сваёй няўмелай палітыкі выхавання дыктатара». «Рэакцыя Еўрасаюза павінна быць аднаэначнай. Хопіць гуляць у гэтыя гульні», — перакананы палітык. Саннікаў лічыць, што праведзеныя вобшукі не маюць ніякага дачынення да так званай «паляўнічай справы». «Ідзе паляванне на найбольш папулярныя незалежныя СМІ ў Беларусі, — заявіў ён. — Цяпер ідуць напады не на журналістаў і палітыкаў, а на ўвесь беларускі народ».

Паводле слоў Саннікава, Аляксандру Лукашэнку «трэба забыць цяпер пра ўсе замежныя крэдыты, таму што наўрад ці хтосьці цяпер захоча фінансаваць дыктатуру».

Але прычым тут Лукашэнка? Ён знаходзіцца з візітам у Венесуэле. «Мы перажываем, напэўна, самы складаны перыяд», — заявіў ён у Каракасе на сустрэчы з прэзідэнтам краіны Уга Чавесам. Ён адзначыў, што беларусы гатовыя пакласці ў агульную чашу ўсё, што маюць самі. «Канечне, мы будзем прасіць вашай падтрымкі ў гэты складаны для нас час. У чым складанасць, я ўжо публічна гаварыў. Але гэта не звязана з грашыма, ёсць рэчы больш важныя. Гэта тычыцца нашага суверэнітэту і незалежнасці — даражэй нічога быць не можа», — заявіў беларускі кіраўнік.

Цікава, ад каго мы будзем абараняць наш суверэнітэт і незалежнасць?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АНДРЭЙ ГЕРАШЧАНКА



Начальнік аддзела па справах моладзі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Віцебска Андрэй Герашчанка, які па сумяшчальніцтве з'яўляецца старшынёй грамадскага аб'яднання «Русский дом», у чарговы раз аскандаліўся. Напрыканцы студзеня чыноўнік у інтэрв'ю парталу расійскага Інстытута краін СНД заявіў, што Беларусь яму бачыцца як яшчэ адна расійская дзяржава, а беларуская мова — штучнае ўтварэнне. Пасля розгаласу ў шэрагу беларускіх СМІ Герашчанку прапанавалі звольніцца, але ён адмовіўся.

На гэтым тыдні Герашчанка адзначыўся сваім каментарам расійскаму інфармацыйнаму агенцтву Regnum з нагоды намеру кінастудыі «Беларусьфільм» зняць фільм паводле рамана Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім». Чыноўнік вырашыў пакрытыкаваць кіраўніка Мінкульта Паўла Латушку. «Латушка доўгі час быў паслом Беларусі ў Польшчы. Ён заўсёды пазіцыянаваў сябе як «шчыры беларус», увесь час гаварыў на мове, намагаўся яе развіваць. Так, у яго быў пэўны перакос у гэты бок. Таму я думаю, што цяперашняя сітуацыя развіваецца не без яго асабістай пазіцыі», — заявіў Герашчанка. Апроч таго ён зазначыў, што экранізацыя рамана Караткевіча — гэта звяно ў ланцугу антырасійскай кампаніі ў Беларусі.

### ЛЮДМІЛА ВОЛЧАК



На X зімовых Паралімпійскіх гульнях у Ванкуверы беларуская спартсменка Людміла Волчак заваявала залаты медаль у лыжнай гонцы на 10 кіламетраў. Такім чынам яна абараніла сваё першынства ў гэтай дысцыпліне, якога дасягнула чатыры гады таму ў Турыне.

Кар'ера лёгкаатлеткі Людмілы Волчак з-за цяжкай траўмы абарвалася за пару гадоў да першых дарослых стартаў на чэмпіянатах свету і Еўропы. Аднак дзяўчына не сышла са спорту. Спачатку былі спартовыя танцы на вазочках, затым — лыжныя гонкі. У Турыне на ўручэнні ўзнагароды вышэйшай пробы, калі ў яе гонар быў узняты сцяг, Людміла не змагла стрымаць слёз радасці — спартовая мара здзейснілася, хаця і такім цяжкім шляхам.

За тры дні X зімовых Паралімпійскіх гульняў у Ванкуверы беларускія спартоўцы заваявалі чатыры медалі — залаты і тры бронзавыя. Бронзу ў капілку зборнай прынеслі Васіль Шапцябой (лыжная гонка на 20 км і біятлонная гонка праследу на 3 км) і Ядвіга Скорабагатая (лыжная гонка на 15 км). На зімовай Паралімпіядзе ў Турыне зборная Беларусі заваявала 9 медалёў — адзін залаты, шэсць срэбных і два бронзавых.

### ЗЯНОН ПАЗНЯК



Лідэр КХП-БНФ Зянон Пазняк падчас запісу перадачы на тэлеканале «Белсат» заявіў, што яго партыя будзе байкатаваць наступныя прэзідэнцкія выбары, а сам ён можа «заўтра прыедзе ў Беларусь».

«Мы будзем праводзіць байкот, — паведаміў Зянон Станіслававіч. — У выбарах зараз удзельнічаць бессэнсоўна». Аднак палітык лічыць, што тактыка байкоту не дасць хуткага выніку: «Мы бачым, што ў грамадстве ёсць непрымание гэтага рэжыму, але людзі трымаюць дулю ў кішэні, гэта не выліваецца ў канкрэтныя формы. Гэты крок ужо зроблены. Трэба рабіць другі, трэці. Ёсць краіны, якія змагаліся за свабоду 500 гадоў і перамагалі — Іспанія». Лідэр КХП–БНФ так і не даў уцямнага адказу, ці будзе ён балатавацца на прэзідэнцкіх выбарах. «Я не сказаў, што не буду ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах. Я сказаў, што мы будзем праводзіць байкот. А сітуацыя можа змяніцца так, што я заўтра прыеду ў Беларусь. Я сказаў, што будзе тактыка байкоту. Я не сказаў, што не буду ўдзельнічаць у выбарах. Такога рашэння з майго боку няма», — цытуе словы Пазняка рэсурс belmy.by.

Апроч таго Зянон Пазняк выказаў меркаванне, што цяпер уплываць з эміграцыі на падзеі ўнутры краіны значна прасцей, чым 20 гадоў таму з-за развіцця тэхналогій: «У мяне няма адчування, што я знаходжуся на нейкім выспе і без мяне нешта там робіцца. Я адчуваю сябе там, я ні адной секунды не быў па-за Беларуссю. Я магу даваць пэўныя заданні. Здалёку я бачу некаторыя рэчы, якія не бачаць зблізку. Цяпер эміграцыя і барацьба на Бацькаўшчыне — гэта практычна адзін працэс». Праўда, палітык не расказаў, якімі тэхналогіямі карыстаецца, каб перыядычна выкрываць у прабеларускім асяроддзі «агентаў КДБ» і «стаўленікаў Масквы».

ЕЎРАНЭСТ

# ШУШКЕВІЧ ХОЧА РАСКАЗАЦЬ ПРАЎДУ, ЯНУКЕВІЧ — КАНТРАЛЯВАЦЬ ПРАГРАМЫ БЕЛАРУСКАГА ЎРАДУ

**На першым пасяджэнні парламенцкай асамблеі «Усходняга партнёрства» Еўранэст ад Беларусі будуць прысутнічаць толькі сябры недзяржаўных грамадскіх аб'яднаняў і апазіцыйных партый. Прадстаўнікі беларускага парламенту, нягледзячы на доўгія спрэчкі вакол тэмы запрашэння, застануцца дома. Журналіст «НЧ» Вольга Хвоін даведалася ў асобаў, што паедуць на сустрэчу ў Брусель, які сэнс іх удзелу ў Еўранэсце.**

Як стала папярэдне вядома, у складзе беларускай дэлегацыі: старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі Станіслаў Шушкевіч, экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін, лідэры партыі «Справядлівы свет» Сяргей Калякін, БНФ — Аляксей Янукевіч, АГП — Анатоль Лябедзька, кіраўнік Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандр Ярашук, старшыня Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч, прадстаўнік Грамадскага аб'яднання «Экадом» Ірына Капорыха, старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жана Літвіна і кіраўніца непрызнанага Саюза палякаў у Беларусі Анжаліка Борыс.

Раней абмяркоўваўся варыянт удзелу ў парламенцкай структуры пяці беларускіх дэпутатаў і пяці прадстаўнікоў апазіцыі. Аднак афіцыйны Мінск адмовіўся ад гэтай прапановы і настойваў, што ўсе дзесяць месцаў мусяць заняць выключна прадстаўнікі парламента. У выніку парламентары, хутчэй за ўсё, застануцца ў сваіх кабінетах, а іх месцы зоймуць прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці.

Старшыня Еўрапарламента Ежы Бузэк сустрэўся са старшынямі фракцый парламента, і канчатковае рашэнне аб складзе беларускай дэлегацыі, як і дата першага пасяджэння Еўранэста, якое было запланавана на 24 сакавіка, адкладзеныя на няпэўны час. Чакаецца, што пытанне наконт беларускай дэлегацыі ў Еўранэсце будзе разгледжана ў першай палове красавіка.

У склад «Еўранэста» ўвойдуць 120 дэпутатаў, у тым ліку 60 дэпутатаў — ад Еўрапарламента і 60 дэпутатаў — ад парламентаў краін-удзельніц «Усходняга партнёрства». Ад Беларусі, Азербайджана, Арменіі, Грузіі, Малдовы і Украіны ў працы парламенцкай асамблеі «Усходняга партнёрства» будуць удзельнічаць па дзесяць прадстаўнікоў.



**Станіслаў Шушкевіч:**

— Я не ведаю, кім і як я заяўлены для ўдзелу ў пасяджэнні парламенцкай асамблеі «Усходняе партнёрства». Звесткі пра гэта я атрымліваю толькі з мас-медыя, афіцыйнага запрашэння на руках не маю. Калі мы і паедзем у Брусель, то толькі ў якасці назіральнікаў, і ўсё, што зможам там рабіць, — быць крыніцамі праўдзівай інфармацыі пра тое, што адбываецца ў Беларусі. У Еўропе цяпер непаразуменне, што ж рабіць далей, бо як новы падыход у адносінах да Беларусі праваліўся. Таму трэба растлумачыць, чаму так адбылося і што цяпер рабіць.

Ёсць многа інструментаў уплыву на тых, хто бярэ грошы з «Усходняга партнёрства» не на дэмакратыю і лібералізацыю, а на ўмацаванне рэжыму. Еўропа разам з Міжнародным валютным фондам выратавала дыктатуру, дык трэба сказаць тым, хто верыць абяцанням Лукашэнкі, што яны не палітыкі, а слухачы. Важна і тое, што да гэтага часу рашэнні па Беларусі прымаліся нейкімі камісіямі, у якія не ўваходзяць людзі, што тут жывуць. І што яны адэкватнага могуць прыняць? Думаю, наш удзел у Еўранэсце найперш важны інфармацыйнай функцыяй.



**Аляксандр Ярашук:**

— Мы спадзяемся, што праект «Усходняе партнёрства» будзе развівацца, што дазволіць Беларусі інтэгравацца з Еўрапейскім саюзам па многіх кірунках — сацыяльных, эканамічных, палітычных. Прафсаюзы з'яўляюцца значным сегментам грамадзянскай супольнасці, таму спадзяёмся скарыстаць гэты шанец, каб данесці свае праблемы і займець пэўную падтрымку ЕС у частцы выканання Беларуссю рэкамендацый Міжнароднай арганізацыі працы (у 2007 годзе за парушэнні правоў прафсаюзаў Беларусь была выключаная з Генеральнай сістэмы прэферэнцый Еўрасаюза — рэд.).

Цяпер найбольш адчувальнымі праблемамі для нас з'яўляюцца ціск на незалежныя прафсаюзы і іх сябраў, дыскрымінацыя па прыкмеце прафсаюзнай прыналежнасці. Гэтыя факты паўтараюцца з года ў год. Апошнія месяцы назіраецца новая хваля ціску на сябраў незалежных прафсаюзаў: амаль усе работнікі знаходзяцца на кароткатэрміновых кантрактах, і калі надыходзіць час іх працягваць, ставіцца ўмова: ці праца, ці сяброўства ў незалежным прафсаюзе. Агулам у Беларусі ў незалежных прафсаюзах маюць сяброўства каля дзесяці тысяч чалавек. З аднаго боку, гэта не многа, а з іншага — гэта людзі, якія зрабілі смелы, асэнсаваны выбар, і, думаю, яны могуць прымусіць з сабою лічыцца.

**Аляксей Янукевіч:**



— Ёсць ініцыятыва, якую і я падтрымліваю, каб мы прадстаўлялі не толькі пазіцыю сваю і сваіх арганізацый ці партый, але і іншых буйных структур, сябры якіх не будуць удзельнічаць у Еўранэсце. Спадзяюся, што перад пасяджэннем Асамблеі мы збяромся тут і выпрацуем агульную пазіцыю і прапановы.

Я разглядаю Еўранэст і наш удзел у ім як магчымасць атрымліваць інфармацыю як мінімум, і як максімум — кантраляваць праграмы супрацоўніцтва паміж ЕС і беларускім урадам. Каб гэтыя праграмы і сродкі максімальна скіроўваліся ў тыя сферы, дзе яны могуць прынесці карысць простым беларусам, а не чыноўнікам.

МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ

# ЗДАБЫТКІ І СТРАТЫ ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

Вольга ХВОІН

**На адзін дэпутацкі мандат мясцовых саветаў прэтэндуюць 1,2 патэнцыйнага кандыдата. Такія вынікі этапу па вылучэнню кандыдатаў, якія хацелі б паўдзельнічаць у красавіцкіх мясцовых выбарах.**

## Конкурс нізкі, але ёсць

Па інфармацыі Цэнтрвыбаркама, у дэпутаты мясцовых саветаў 26-га склікання было вылучана каля 25,5 тысячы чалавек. Гэта больш, чым падчас папярэдніх трох кампаній. Старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына звязвае наплыў кандыдатаў у кандыдаты з павелічэннем цікаўнасці да сельскіх саветаў.

«Нават у гэтыя саветы, раней не папулярныя сярод вылучэнцаў, пададзена на дзве тысячы заявак больш, чым запатрабавана», — перадае словы Ярмошынай БелТА. Найбольш канкурэнтаў будуць мець кандыдаты па мінскіх акругах — 5,4 прэтэндэнты, у абласныя саветы — 1,8, у раённыя — 1,3, у гарадскія саветы і саветы гарадоў абласнога падпарадкавання — 2,1, у сельскія — 1,1.

## Актыўныя нелегалы

Частка беларускай апазіцыі на этапе вылучэння кандыдатаў прапанавала абмеркаваць варыянт адмовы кандыдатаў ад далейшага ўдзелу ў мясцовых выбарах. У прыватнасці, прадстаўнікі Аб'яднаных дэмакратычных сілаў лічаць, што выхад з выбарчай кампаніі можа быць апраўданы неўключэннем у склад выбаркамаў значнай колькасці прадстаўнікоў апазіцыі. Ад АДС у выбаркамы патрапілі сто чалавек, што складае толькі 0,15 працэнта ад агульнай колькасці сябраў участковых камісій, якія і займаюцца непасрэдным падлікам галасоў.

Самай актыўнай палітычнай партыяй (хоць і апальнай, незарэгістраванай) гэтай кампаніі з'яўляецца Беларуская хрысціянская дэмакратыя. БХД вылучыла 173 патэнцыйныя кандыдаты ў дэпутаты па 226 акругах. Расстаноўка сілаў па іншых партыях выглядае наступным чынам: праўладная Камуністычная партыя Беларусі — 207 кандыдатаў, Беларуская партыя левых «Справядлівы свет» — 126, Аб'ядналая грамадзянская партыя — 94, партыя БНФ — 35, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) — 32, Беларуская партыя «Зялёныя» — 5, Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада — 2 чалавекі.

Партыйныя прэтэндэнты складаюць 2,3 працэнты ад агульнай колькасці асоб, вылучаных кандыдатамі ў дэпутаты.

## Страта

З перадвыбарчай дыстанцыі добраахвотна выйшаў мінскі блогер Яўген Ліпковіч. У апошні дзень падачы дакументаў на рэгістрацыю ён распаўсюдзіў заяву, што яго кампанія насамрэч мела эксперыментальную мэту і палітычных амбіцый ужо былы «кандыдат у кандыдаты» не мае. «Незадоўга да выхаду Указу № 60 (аб рэгуляванні інтэрнэту ў Беларусі — рэд.), 20 студзеня гэтага года радыёстанцыя «Нямецкая хваля» спытала ў мяне аб ступені ўплывовасці інтэрнэту ў Беларусі. Я адказаў: «Не. Інтэрнэт у нас не карыстаецца ніякім уплывам. У дзесяцімільённай краіне 300 000 наведванняў партала TUT.BY у дзень — гэта кропля ў моры», — тлумачыць сутнасць свайго эксперыменту спадар Ліпковіч.



Далей ён расказаў, што пасля старту яго кампаніі відэаінтэрв'ю за адзін дзень дало 17 000 запампоўванняў, ініцыятыўная група ў 10 чалавек была цалкам сфарміраваная праз інтэрнэт. Каманда Ліпковіча сабрала за яго вылучэнне 233 подпісы, але толькі тры з іх былі сабраныя пры дапамозе інтэрнэту. «Дзейсных званкоў было два. За месяц. І яны далі толькі тры подпісы. Тры! Гэта менш за 1 працэнт. Гэта нават не статыстычная хібнасць. Інтэрнэт і сацыяльныя сеткі ў нашай краіне не карыстаюцца ніякім уплывам. Ніякім. Што і патрабавалася даказаць, — канстатуе блогер. — Тыя, хто рыхтаваў Указ № 60 аб рэгуляванні байнэту — сапраўдныя параноікі, якія баяцца ўласнага ценю. У мяне няма ніякіх палітычных амбіцый. Я духоўна належу да пакалення, якое гаварыла, што лепш лезці ў бруд, чым у палітыку».

Пасля гэтай заявы на адрас Ліпковіча пасыпаліся абвінавачванні, што ён «кінуў» людзей, якія яго падтрымлівалі, «хварэлі». Аднак, аказваецца, спадар Яўген ад пачатку не меў намеру быць дэпутатам.

Зрэшты, у апраўданне беларускага сегменту сацыяльных сетак ёсць некалькі кампаній, калі людзі праз інтэрнэт аб'ядноўваліся дзеля агульнай мэты — абарона Лошыцкага парку, збор грошай на вызваленне пад заклад палітвязня Дзяніса Дзянісава, пошук сабакі блогеркі muha_elka. Дзякуючы інтэрнэтчыкам была раскручаная леташняя гісторыя з Менцюком і «жывым шчытом». Але ёсць адна акалічнасць: фактычна ўсе гэтыя кампаніі былі па-за палітыкай. Дык, магчыма, праблема не ў санлівасці беларускіх інтэрнэткарыстальнікаў, а ў прадмеце спрэчкі.

БЕСПРАЦОЎЕ

# «ЦІХАЯ» ДАПАМОГА

Вольга ХВОІН

**Афіцыйны ўзровень беспрацоўя ў Мінску на 1 сакавіка 2010 года склаў 0,4 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва. У службах занятасці сталіцы зарэгістравана звыш 4,5 тысячы беспрацоўных. У чалавека заўжды ёсць выбар, як уладкаваць сваё жыццё. Нехта звяртаецца па дапамогу ў працаўладкаванні ў органы сацыяльнай занятасці, а нехта спрабуе пачаць сваю справу. У Беларусі нават дзейнічае пастанова ўраду, паводле якой можна атрымаць невялікую датацыю на развіццё ўласнай справы. Наколькі дзейснай і даступнай з'яўляецца такая дапамога — справа іншая.**

Паводле пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб садзейнічанні беспрацоўным у арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці» ад 16 студзеня 2009 г. № 37, існуюць субсідыі, якія выдзяляюцца тым, хто хоча адкрыць уласны бізнес. Праграма існавала і да 2009 года, але потым была адкарэктаваная. Цяпер беспрацоўны можа атрымаць ад 2 млн. 807 тысяч да 3 млн. 828 тысяч рублёў (11–15 бюджэтаў пражытачнага мінімуму), падаўшы заяву і свой бізнес-план у органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы сваёй рэгістрацыі. Там на працягу 14 каляндарных дзён вашу заяву мусяць разгледзець і прыняць рашэнне наконт выдачы субсідыі. Заканадаўства прадугледжвае, што дапамога гэта можа выплачвацца толькі аднойчы, прадстаўленыя грошы трэба засвоіць на працягу трох месяцаў, а пасля быць гатовым, што на працягу года будуць правяраць, як новаспечаны прадпрымальнік рэалізуе бізнес-план.

Натуральна, у Мінску ці іншым буйным горадзе наладзіць сур'ёзны бізнес з такім малым стартавым капіталам праблематычна. Давядзецца дадаваць уласныя зберажэнні, калі яны ёсць. Бадай што гэтая дапамога мае сэнс і больш адчувальная для жыхароў невялікіх гарадкоў, вёсак, дзе накладныя расходы (як, напрыклад, арэнда памяшкання) змянныя. Напрыклад, можна паспрабаваць адчыніць майстэрню па рамонту абутку, маленькую цырульню (хаця наўрад ці за гэту суму мажліва набыць з нуля ўсё абсталяванне і інструменты для працы). Бяруць гэтыя субсідыі і тыя, хто хоча займацца аграрнымі справамі — вырошчваць сельгаспрадукцыю, разводзіць хатнюю жывёлу. За мінулы год субсідыі на адкрыццё ўласнай справы праз органы па працы, сацыяльнай абароне і занятасці ў Беларусі атрымалі больш за 1,5 тысячы беспрацоўных.

Хто непасрэдна сутыкаўся з гэтай сістэмай, гаворыць, што атрымаць дапамогу ў прынцыпе нескладана — патрэбны добры бізнес-план. Праўда, факт і тое, што не кожны пачатковец захоча, каб да яго год хадзілі з праверкамі. Аднак і ў гэтай бяздзе бы добрай справе можна «нарабіць каламуці». Напрыклад, наладзіць сістэму адкатаў ды браць субсідыі праз падстаўных беспрацоўных.




Photo.ByMedia.Net

«Ствараеш добры бізнес-план, «дамаўляешся» з выканкамам і маеш грошы. Беспрацоўнаму, пад якога пішацца гэты праект, пасля даеш невялікі «адкат». Ведаю некалькіх чалавек, якія не адзін год так зарабляюць грошы», — падзяліўся шэраг схемай адзін з дробных прадпрымальнікаў.

Істотным мінусам ініцыятывы дапамагаць пачаткоўцам у бізнесе з'яўляецца тое, што пра саму пастанову ўраду ведае не так многа людзей. Напрыклад, каардынатар РГА «Перспектыва» Анатоль Шумчанка сказаў, што не валодае інфармацыяй ні наконт гэтай юрыдычнай нормы, ні наконт таго, каб нехта ёй карыстаўся. Кіраўнік руху «За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва» Віктар Гарбачоў таксама зазначыў, што з кола знаёмых яму ІП ніхто свой бізнес з гэтых субсідый не пачынаў.

«Ведаю толькі аднаго чалавека, які браў субсідыю, — знаёмы фермер. Але застаўся незадаволены гэтай дапамогай, бо да яго ледзь не з пракуратуры прыходзілі, патрабуючы справаздачнасць аб расходзе сродкаў. Думаю, гэтай дапамогай карыстаецца зусім мала людзей — знаёмыя мясцовых чыноўнікаў, набліжаныя да ўлады асобы», — мяркуе Гарбачоў. Хаця кіраўнік прадпрымальніцкага руху і пагаджаецца, што сама ідэя добрая: «Калі б яна была разрэкламаваная як мае быць, каб інфармацыя даводзілася да ўсіх, а не да вузкага кола людзей, карысці было б больш. А атрымліваецца, што нават мы, прадпрымальнікі, нічога не ведаем наконт магчымай падтрымкі».

ІНТЭГРАЦЫЯ

# ПА ПЫТАННЯХ СУВЕРЭНІТЭТУ

Вольга ХВОІН

**Сустрэча прэм'ераў Беларусі і Расіі ў Брэсце адбылася ў час, калі кіраўніка Беларусі ў краіне не было. Аляксандр Лукашэнка знаходзіўся з візітам у Лацінскай Амерыцы. І першая асоба Беларусі, і прэм'ер па розныя бакі Атлантыкі займаліся адной справай — шукалі рэсурсы для беларускай эканомікі, то бок для падтрымання незалежнасці.**




Уладзімір Пуцін падчас свайго візіту канстатаваў, што Расія працягвае даваць датацыі беларускай эканоміцы за кошт танных энергарэсурсаў. У якасці аргументу — цана на газ. У першым квартале бягучага года Расія пастаўляла Беларусі прыродны газ па 169 долараў за тысячу кубаметраў. Не параўнаць з Украінай — ёй блакітнае паліва абыходзіцца ажно ў 304 долары. Расійскі прэм'ер-міністр прадэманстраваў веданне матэматыкі, агучыўшы бонусы, якія Беларусь атрымлівае (пакуль яшчэ) ад сваёй суседкі. «Калі параўнаць са сярэднееўрапейскім коштам, то выйгрыш Беларусі складае 2 млрд. 600 млн. долараў. Плюс Расія пастаўляе 6,3 млн. тон нафты бязмытна. Гэта яшчэ 1 млрд. 600 млн. долараў», — цытуе словы Пуціна БелаПАН.

Эканамічную лаяльнасць кіраўнік расійскага ўрада аргументаваў «развіццём інтэграцыйных працэсаў», мэтазгоднасць якіх Лукашэнка не так даўно паставіў пад сумненне.

Пасля азнаямлення з дакладам аб першых месяцах дзеяння адзінага мытнага тарыфу і выніках пасяджэння Камісіі Мытнага саюза кіраўнік Беларусі заначыў, што беларускі бок хацеў бы кіравацца ў стварэнні гэтай структуры «класічным паняццем, класічнымі прынцыпамі, якія агульнавядомыя».

«Калі пачаць рабіць агаворкі і канфіскоўваць нафту, нафтапрадукты, газ, цукар, малако, алей, мяса, пшаніцу, то такі Мытны саюз, пэўна, ні Расіі, ні Казахстану, ні Беларусі не патрэбны, — заявіў Лукашэнка. — Галоўнае пытанне: наколькі гэты саюз і тыя прапановы і прапрацоўкі, якія былі зробленыя падчас перамоў у Маскве, адпавядаюць інтарэсам Беларусі, беларускага народа». У сферы інтарэсаў «беларускага народа» і ўлады, што стаіць над гэтым народам, натуральна, грошы. І пакуль магчыма, за іх трэба змагацца, «таму што потым, калі гэты працэс стане незваротным, ужо будзе позна змагацца за ўласныя інтарэсы». «Мы не настолькі багатыя, каб ахвяраваць нейкімі інтарэсамі. Мы не Казахстан і тым больш не Расія — у іх ёсць чым ахвяраваць, у іх шмат запасаў вуглевадароднай сыравіны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Але няма таго, што было раней. З гэтага года РФ згарнула субсідыі ў Беларусь праз танную нафту. У выніку нафтаперапрацоўваючая галіна, якая многія гады была для айчыннага бюджэту крыніцай валютных паступленняў, сышла ў мінус. Паводле звестак Белстата, рэнтабельнасць нафтаперапрацоўкі ў студзені склала мінус 22,3 працэнта супраць 5,3 працэнта за мінулы год. А страты беларускіх НПЗ за першыя два месяцы 2010 года дасягнулі 11 млн. долараў. Беларускае кіраўніцтва лекі для НПЗ прапісала ў выглядзе адмены экспартнай мыты на вывазныя нафтапрадукты, а таксама бюджэтных субсідый. Праўда, расслабляцца нафтавай галіне не дазволіла і паставіла задачу па выніках першага квартала выйсці на бясстратную працу.

Аднак бюджэту для падтрымкі айчыннай нафтавай галіны відавочна малавата. І Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з сяброўска-дзелавым візітам у Венесуэлу. Весткі з лацінаамерыканскіх палітычных палёў эканамістаў увялі ў стан зацяжнога сарказму. Паводле афіцыйнай інфармацыі, Беларусь у хуткім часе скіне з сябе ярмо нафтавай залежнасці ад Расіі і адновіць працу НПЗ за кошт паставак венесуэльскай нафты. Натуральна, пасля выдаткаў на транспарціроўку, гэта нафта па сваіх коштах пераўзыдзе расійскую. Але калі будзе арганізаваны «міжсабойчык»... Бакі дамовіліся аб сумеснай перапрацоўцы нафты і рэалізацыі нафтапрадуктаў на еўрапейскім рынку. Па афіцыйнай інфармацыі, Венесуэла з мая будзе пастаўляць у Беларусь 80 тысяч барэляў нафты ў дзень.

У свайго прыяцеля і калегі Уга Чавеса беларускі лідэр прасіў падтрымкі ў абароне незалежнасці, што азначае — прасіў грошай. «Я не хачу, каб нават апазіцыя тут думала, што мы прыехалі сюды, каб дзесьці па вялікім рахунку або па дробязях зарабіць. ...Канечне, мы будзем прасіць вашай падтрымкі ў гэты складаны для нас час. У чым складанасць, я ўжо публічна гаварыў. Але гэта не звязана з грашыма, ёсць рэчы больш важныя. Гэта тычыцца нашага суверэнітэту і незалежнасці — даражэй нічога быць не можа», — заявіў Лукашэнка на пачатку міждзяржаўных перамоў.

У выніку бакі дамовіліся «па ўсіх пытаннях»: «Цягам бліжэйшых пяці гадоў мы пабудуем у Венесуэле 3–4 заводы па вытворчасці трактароў, аўтамабіляў, вялікагрузных аўтамабіляў, буйны цагельны, разлічаны на выпуск 100 тысяч тон умоўнай цэглы… У бліжэйшы час мы пабываем на будоўлях, будуць адкрытыя новыя радовішчы, новыя пасёлкі, якія пабудавалі для нашых венесуэльскіх братоў», — заявіў Лукашэнка па выніках перамоў.

Чакаецца, што з Венесуэлы Лукашэнка паляціць у Бразілію, каб сустрэцца з яе кіраўніком Лула Інасіо да Сільва і дамовіцца «па ўсіх пытаннях».

ЛЁС

# SMS-ДЗЁННІК З МІНУЛАГА СТАГОДДЗЯ

Вольгі ХВОІН

**Не горад і не вёска. Мястэчка — полікультурны мікракосмас, які Беларусь страціла на пачатку мінулага стагоддзя, хаця сляды яго яшчэ раз-пораз можна сустрэць, вандруючы па краіне. Напрыклад, ёсць выраз «прайсці па мястэчку» — то бок прагуляцца па гарадку, па крамах.**

**Вёска Цімкавічы Копыльскага раёна мае багатую і даўнюю гісторыю — больш за пяць вякоў. У мінулым стагоддзі яна мела нават свайго «летапісца». Як беларус задоўга да IT-рэвалюцыі засвоіў сучасны фармат мэсіджаў і якая карысць ад звычкі весці дзённікі?**



Вёска Цімкавічы. Касцёл Св. Міхала Арханёла. Фотаздымак з кнігі Міхася Чарняўскага «Правадыр крылатых вершнікаў»

Паданне гаворыць, што ў ваколіцах цяперашніх Цімкавічаў жыў асілак Цімка, які закахаўся ў дзяўчыну-самадурку. І вось загадала каханая вывернуць з карэннем магутны дуб. Доўга змагаўся хлопец з дрэвам і ўрэшце выкарчаваў яго, але сам урос у зямлю. У напамін пра гэту гісторыю паселішча назвалі Цімкавічы...

## Цімкавіцкі sms-дзённік

У стандартную sms-ку змяшчаецца 160 сімвалаў. Задоўга да з'яўлення мабільнай сувязі жыхар Цімкавічаў Аляксандр Міхайлавіч Андруковіч вёў штодзённыя запісы, якія лёгка ўкладваюцца ў сучасны фармат шот-паведамленняў. Своеасаблівы лаканічны летапіс мястэчка.

Гісторыя Цімкавічаў налічвае больш за паўтысячагоддзя. Напрыканцы XIX — пачатку XX стагоддзя мястэчка мела развітую інфраструктуру: паштовую станцыю, дзве царквы, касцёл, габрэйскія школы, крамы, спіртзавод, хлебапякарню... Да нашых часоў з гэтага дайшло нямнога. Напрыклад, касцёл святога Міхаіла Архангела згарэў у 1985 годзе. Але засталіся збудаваныя ў памяць аб адмене прыгоннага права мураваная капліца са званіцай. Пачынаючы з 1652 года, калі Цімкавічы атрымалі Магдэбургскае права, кожную нядзелю ў мястэчку ладзіліся кірмашы.

Цімкавічы былі радзімай шэрагу выбітных асобаў: у 60-х гадах XIX стагоддзя ў габрэйскую школу хадзіў будучы класік габрэйскай літаратуры Мэндэле Мойхер Сфорцым, тут вучыліся пісьменнік Кузьма Чорны, экс-прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі Аляксандр Вайтовіч, агулам з гэтых краёў выйшлі адзінаццаць дактароў навук, трыццаць кандыдатаў навук.

Сын героя матэрыялу — Аляксандра Андруковіча — былы вайсковец, ужо на пенсіі, жыве ў Слуцку, але бацькавы запісы пра жыццё ў Цімкавічах у пажаўцелых ад часу сшытках захоўвае ашчадна і трапятліва. Як і фотаздымкі сямейнага альбому: аддрукаваныя на прыгожых кардонных планшэтах у даваенных атэлье ці на простай паперы — невядомым фотааматарам. Гэта гісторыя не толькі асобнага роду, але і мястэчка.

— Бацька ажаніўся толькі ў пяцьдзесят гадоў. І я не памятаю яго маладым, у маіх успамінах ён заўжды сівы, — пачынае свой расповед Міхаіл Аляксандравіч. — У 1910 годзе тату забралі ў войска, і падчас першай імперыялістычнай вайны ён патрапіў у палон і прабыў у Нямеччыне ажно пяць гадоў, працаваў там на гаспадарцы бюргера. Пакуль быў у палоне, пісаў дадому лісты, распавядаў, як яму там жывецца. Былі нават фотаздымкі таты з тутэйшымі паненкамі, расказваў, што збіраўся ажаніцца. Але ў 1919 годзе вярнуўся дадому, ужо ў савецкую Беларусь, пачаў працаваць у калгасе старшынёй рэвізійнай камісіі, стварыў сям'ю.

Аляксандр Міхайлавіч быў чалавекам пісьменным, яшчэ за царскім часам скончыў Слуцкую гімназію, таму карыстаўся павагай сваіх аднавяскоўцаў, вучыў на даму дзяцей. «Я столькі не прачытаў твораў класікаў, як мой бацька. Памятаю, да яго мужыкі прыходзілі, любіў пагаварыць — і пра навіны, і пра палітыку», — расказвае сын.

Многім знаёмае памкненне пачаць весці ўласны дзённік. Але ўслед за такім намерам узнікае пытанне: каму гэта патрэбна? Пасля прачытання запісаў спадара Андруковіча можна сказаць, што праз дзесяткі год вашыя нататкі могуць быць карыснымі не толькі нашчадкам. Дзённікі спадара Андруковіча лаканічныя, збольшага тычацца спраў гаспадарчых, сямейных: са сваяком выпівалі з нагоды Ражаства, аднавясковец памёр, карова «гуляла», траву касіў... Але з гэтых запісаў лёгка сканструяваць побыт жыхароў мястэчка таго часу, іх працы і гаспадарчыя клопаты. З таго, што захавалася, запісы пачынаюцца з 1 студзеня 1941 года. Даследчыкам, натуральна, найбольш цікавыя нататкі паваенных часоў. Думаеце, вайна цалкам разбурае жыццё, незваротна змяняе яго лад?

*«22 чэрвеня 1941 года, нядзеля. Даведаўся пра напад на Савецкі саюз.*

*23 чэрвеня 1941 года, панядзелак. Прызыў, не працаваў.*

*24 чэрвеня 1941, аўторак. Сеяў, але быў абстраляны з самалёта кулямётным агнём. Кінулі і сышлі.*

*25 чэрвеня 1941, серада. Дзень прайшоў адносна спакойна, але насельніцтва збіраецца ў бежанцы.*

*26 чэрвеня 1941, чацвер. У гадзін 12 дня прыйшлі немцы (было спякотна).*

*27 чэрвеня 1941, пятніца. Ішоў бой увесь дзень. Былі пажары.*

*28 чэрвеня 1941, субота. Было чуваць артылерыйскую кананаду, але мясцовым было больш спакойна.*

*29 чэрвеня 1941, нядзеля. Пачаўся ход немцаў на машынах.*

*30 чэрвеня 1941, панядзелак. У калгасе не працуюць, усё разграбленае. Я пасвіў кароў у чаргу».*

А далей жыццё вяртаецца ў сваю каляіну. Гаспадар барануе соткі, косіць траву на поплаве, возіць сена, дровы, не забываецца, што вайна вайной, а Бог усё бачыць, і гнявіць яго не варта, таму на Спас «не працаваў». Вайна з'яўляецца ў запісах толькі з нагоды надзвычайных здарэнняў: як у вёску прыходзілі немцы ці савецкія войскі.

## Капалі ямы на задніх...

Цімкавічы былі тыповым беларускім мястэчкам. А якое ж мястэчка без габрэяў? Прынамсі так было да вайны. Гісторык Іна Соркіна з Гродна займаецца вывучэннем беларускіх мястэчак, што, на жаль, зніклі з культурна-сацыяльнага ландшафту Беларусі разам са сваёй шматэтнічнасцю і непаўторнасцю. Мястэчкі былі канцэнтраванымі месцамі габрэйскай культуры. Аднак у 20–30 гады мінулага стагоддзя жыццё зварочвае на новыя рэйкі. Падчас вайны габрэі ў Беларусі былі амаль вынішчаныя, а мястэчкі ператварыліся ў звычайныя паселішчы. Цяпер мы маем гарады і вёскі агульнага тыпажу, з прыблізна аднародным складам насельніцтва паводле веры і культуры. Беларуская аўтэнтыка канца XIX — пачатку XX стагоддзя сышла ў нябыт.

Міхаіл Андруковіч пераказвае аповеды свайго бацькі:

— Калі немцы прыйшлі ў Цімкавічы, то першы час нікога не чапалі. А пасля нехта данёс, што ў мястэчку застаўся міліцыянер. Яго знайшлі і забілі. І жанчыну, якая схавалася са страху ў пярыну, застрэлілі...

А вось што сведчыць дзённік: «8 верасня 1941. Мястэчка ачапілі. Усіх выгналі на плошчу, габрэяў асобна».

Пасля гэтай «сарціроўкі» габрэям загадалі на спіне насіць нашытую зорку Давіда. Далей ідзе такі запіс: *«Пасвіў кароў, 14 штук. Без габрэйскіх».*

*«26 кастрычніка 1941. Перасяленне габрэяў — зрабілі гета».*

Гета было створана па адзін бок вуліцы, на другім пакінулі жыць цімкаўцаў. За пераход вуліцы з таго ці іншага боку пагражала пакаранне расстрэлам усёй сям'і. Міхаіл Аляксандравіч гаворыць, што часам нехта і наважваўся парушыць парадак: «Я быў малы, але памятаю, што колькі разоў да нас прыходзілі з гета па нейкіх справах. То маці заўжды моцна баялася, трымцела ўся».

Чытаем дзённік далей.

*«9 студзеня 1942. Трэці дзень Ражаства Хрыстова, мароз, рабіў махорку дома.*

*6 сакавіка 1942. Варта на вуліцы.*

*17 сакавіка 1942. Капаў яму на задніх...»*

Гэты запіс патрабуе ўдакладнення. Міхаіл Аляксандравіч гаворыць, што бацька распавядаў, як вяскоўцаў прымушалі капаць ямы на задворках вёскі, якія пасля сталі магіламі для габрэяў. Але ішла вайна, і бацька асцерагаўся, каб дзённік не знайшлі. Таму апісанне вострых момантаў размытае, асобныя словы наўмысна накрэмзаныя неразборліва.

*«21 сакавіка 1942. Мароз 30° С.*

*25 сакавіка 1942. Пахмурна, поўная адліга, жыдоўскі расстрэл».*

Дарэчы, у сакавіку 1942 года былі масавыя пагромы і ў буйнейшым на тэрыторыі Беларусі гета — Мінскім. Праз некалькі месяцаў Цімкавіцкае гета перастала існаваць.

*«26 чэрвеня 1942. Расстрэл жыдоў.*

*27 чэрвеня 1942. Дабівалі жыдоў.*

*30 чэрвеня 1942. Вазіў з гета габрэйскія рэчы.*

*16 ліпеня 1942. Налёт на мястэчка партызан. Ноч не спалі, выносілі рэчы на выпадак пажару».*

З Цімкавіцкага гета змог уратавацца толькі адзін габрэй — Ісаак Садоўскі. Яго вялі разам з усімі на расстрэл, а ён кінуўся бегчы. Канвой пачаў страляць, Ісаак паваліўся, і немцы вырашылі, што забілі яго. Чалавек праляжаў так увесь дзень, бачыў, як правялі габрэяў, як усіх расстралялі. І толькі ноччу наважыўся сысці, пазней быў у партызанах. Ісаак пасля вайны з'ехаў з Беларусі. Толькі цімкаўцы кажуць, што ў чужым краі ён так і не пажыў: нібыта памёр ці то ў самалёце, ці ў хуткім часе па прылёту.

Пасля вайны ў 1946–1947 гадах на месцы расстрэлу габрэяў паставілі невялікі помнік. Надпіс на ім сцвярджае, што пад Цімкавічамі свой спачын знайшлі 960 габрэяў. Цяпер дырэктарка Музея гісторыі і культуры габрэяў Беларусі Іна Герасімава спрабуе высветліць акалічнасці трагедыі, імёны загінулых, а таксама спраўдзіць інфармацыю, што апроч Ісаака Садоўскага смерці пад Цімкавічамі пазбег яшчэ адзін чалавек. Міхаіл Аляксандравіч расказвае сямейную гісторыю: быццам бы жонка яго дзядзькі, застаўшыся адна з трыма дзецьмі, доўгі час хавала ў склепе габрэя Шостэра, які ўцёк з гета. Быццам бы пасля вайны ён стаў вядомым урачом, жыў у Бабруйску і прыязджаў у Цімкавічы, каб аддзячыць Веры Валькоўскай за сваё ўратаванне. Калі так, то спіс беларускіх Праведнікаў свету можа папоўніцца яшчэ адным імем.



Вёска Цімкавічы. Краявіды

*Аўтар выказвае падзяку дырэктару Музея гісторыі і культуры габрэяў Беларусі Іне Герасімавай за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 22 САКАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05** Nota Bene.
**09.35** «Зорныя танцы». Мужчынскі сезон.
**11.00** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Камедыйная меладрама «Сеньёр 15 шароў» (Італія).
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**15.55** Здароўе.
**16.20** Серыял «Агні вялікага горада».
**17.20** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**18.50, 00.25** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна».
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.55** Адмысловы рэпартаж АТН «Куды адводзяць дзяцінства…».
**22.30** Драматычны серыял «Доктар Хаўс. Чацвёрты сезон» (ЗША).
**23.35** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.30** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Дыханне планеты».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Тэорыя невераґоднасці.
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. IV-ы сезон. 7-я серыя.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Злачынствы стагоддзя».
**23.50** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.35** Нашы навіны.
**00.50** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Прыватныя гісторыі».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** «Вялікі горад».
**15.40** «Гарачы лёд».
**16.05** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Дабро пажаліцца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Хачу дзіця». Украіна, 2008 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Братэрства Ваўка».Францыя.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Крымінальная камедыя «Маўчы ў анучку» (Вялікабрытанія).
**12.25** «Пра мастацтва».
**12.50** Школа рамонту.
**13.50** Мультсерыял «Галактычны футбол».
**14.15** Пазакласная гадзіна.
**14.30** Бухта капітанаў.
**15.05** Тэлебарометр.
**15.25** Дэтэктыў «Зброя» (Расія). 1-я серыя.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Калыханка.
**21.25** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**23.00** Хакей. Формула гульні.
**23.25** Дэтэктыў «Зброя» (Расія). 1-я серыя.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.15** «Поўны верай і каханнем. Мікалай Солдаценкаў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Ранішняя пошта».
**11.55** Фільм «Супраць плыні».
**13.20** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.20** Фільм «Рассмяшыць Бога».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «След саламандры».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.50** «Нічога асабістага».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Весткі+».
**00.35** «Мой срэбны шар».

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** «Праграма Максімум».
**09.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Кулінарны паядынак».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.30** Камедыйная меладрама «Маладыя і шчаслівыя».
**15.00** «Сярэдні клас».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.35** Серыял «Кодэкс гонару».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**21.30** Вострасюжэтны серыял «Ганчакі-2: На мяжы шаленства».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.25** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Ралійная серыя IRC. Аргентына. Дзень 2.
**10.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Планіца.
**11.00** Марафон. Сеул.
**12.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Кругавы раўнд. Германія-Данія.
**14.00** Шорт-трэк. Чэмпіянат свету. Сафія.
**15.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 10 км вольным стылем. Фалун.
**15.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Планіца.
**16.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Масстарт. Осла.
**17.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Масстарт. Осла.
**17.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Планіца.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**20.45** Футбол. Еўрагалы.
**21.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**21.30** Футбол. Еўрагалы.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**00.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Масстарт. Осла.
**01.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Масстарт. Осла.
**01.30** Фігурнае катанне. Зімовыя алімпійскія гульні. Паказальны выступ. Ванкувер.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Еўропа сёння.
**17.40** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.40** Госць «Белсату».
**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.50** ПраСвет.
**20.10** «Пішчалаўскі замак», дак. фільм.
**20.40** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Фільматэка майстроў: «Пінжак», маст. фільм, 2005 г., ЗША.
**23.00** Аб'ектыў.

## 23 САКАВІКА, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.05** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна).
**09.50** Серыял «Агні вялікага горада».
**10.45** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Загадка беларускай бузы».
**12.10** Прэм'ера. Меладрама «Лабірынты кахання» (Украіна).
**13.45** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «У гасцях у швецкага караля. Стакгольм».
**15.55** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**16.50** Серыял «Агні вялікага горада».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.55** Драматычны серыял «Доктар Хаўс. Чацвёрты сезон» (ЗША).
**23.05** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Георгій Жжонаў. «Усё, што магу…».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**22.05** Прэм'ера. «Сем жонак аднаго халасцяка». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Зваротны адлік».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Хачу дзіця». Украіна, 2008г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Пяць гісторый».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Пажар на тэлевежы». Германія, 2007 г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.30** «Запал па культуры».
**12.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**13.05** Хакей. Формула гульні.
**13.30** Кінаспробы.
**13.55** Мультфільм.
**14.05** Мультсерыял «Галактычны футбол».
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**14.45** Свая кампанія.
**15.25** Вострасюжэтны дэтэктыў «Зброя» (Расія). 2-я серыя.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Калыханка.
**21.25** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.00** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Фінал. 1-ы матч.
**23.55** Спорт-кадр.
**00.25** Вострасюжэтны дэтэктыў «Зброя» (Расія). 2-я серыя.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Апошняя гастроль Джо Дасэна». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага».
**11.40** Тэлесерыял «След саламандры».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Прэм'ера. Тэлесерыял «Суд». Расія.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «След саламандры».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Нармандыя - Нёман. У нябёсах мы лёталі адных...».
**01.15** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**08.55** «Прафесія-рэпарцёр».
**09.20** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.05** «Кватэрнае пытанне».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Камедыйная меладрама «Маладыя і шчаслівыя».
**15.00** «Сярэдні клас».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.35** Серыял «Кодэкс гонару».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**21.35** Вострасюжэтны серыял «Ганчакі-2: На мяжы шаленства».
**23.15** Сёння.
**23.35** Прэм'ера. «Рускія не здаліся!».
**00.30** «Фатальны дзень».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**11.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Масстарт. Осла.
**11.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Масстарт. Осла.
**12.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 215. Планіца.
**13.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Абавязковая праграма. Турын.
**17.30** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Кругавы раўнд. Швецыя-Германія. Свіфт-Карэнт.
**19.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Абавязковая праграма. Турын.
**21.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Пары. Кароткая праграма. Турын.
**00.00** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit. Сочы.
**00.30** Ралі. Ралійная серыя IRC. Аргентына. Агляд.
**01.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**01.45** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Абавязковая праграма. Турын.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Праект «Будучыня».
**17.40** МакраФон: «Новая традыцыя», канцэрт Доны Розы.
**18.20** Невядомая Беларусь: «Далёка нам яшчэ да БНР», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**18.50** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.50** Беларусы ў Польшчы.
**20.10** Акно ў Еўропу.
**20.40** Асабісты капітал.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Каханне, здрада, жарсць», серыял, 2003 г., Аўстрыя.
**22.05** Форум (ток-шоў): «Кесару – кесарава: падаткі ў Беларусі».
**22.45** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 24 САКАВІКА, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00,.**
**23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрэсаў.
**09.05** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна).
**10.00** Серыял «Агні вялікага горада» (Расія).
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм «Фаворское святло жабінкаўскіх знічак» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Прэм'ера. Камедыя «Белы паравоз» (Украіна).
**13.35** Дакументальны фільм.
**14.05** Адмысловы рэпартаж АТН «Куды адводзяць дзяцінства…».
**14.40** «OFF STAGE LIFE».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Альманах вандраванняў.
**15.55** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**16.45** Серыял «Агні вялікага горада» (Расія).
**17.40** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.35** Дзённік «Мінск-Вена-2010».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**20.00** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.55** Драматычны серыял «Доктар Хаўс. Чацвёрты сезон» (ЗША).
**23.05** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**22.05** Прэм'ера. «Сем жонак аднаго халасцяка». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.35** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Новыя парадожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Мінск і мінчане».
**23.25** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.50** Фільм «Элітны атрад». ЗША-Бразілія-Нідэрланды, 2007г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.25** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.10** Спорт-кадр.
**12.40** Дак. фільм «Апошнія арлы».
**13.10** Мультфільм.
**13.25** Мультсерыял «Галактычны футбол».
**14.15** Пазакласная гадзіна.
**14.25** Лабірынты: Лявон Вітан-Дубейкаўскі.
**14.55** Медычныя таямніцы.
**15.25** Вострасюжэтны дэтэктыў «Зброя» (Расія). 3-я серыя.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.15** Калыханка.
**21.30** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.05** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Фінал. 2-і матч.
**00.00** Вострасюжэтны дэтэктыў «Зброя» (Расія). 3-я серыя.

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Руськія без Расіі. Руская муза французскага супраціву». Дак. фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «След саламандры».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Суд». Расія, 2009 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «След саламандры».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Лёс легіянера. Невядомы сын Горкага». Дакументальны фільм.

НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Вырατавальнікі».
**09.00** «Галоўная дарога».
**09.30** «Асабліва небяспечны!».
**10.15** «Таблетка ад старасці».
**11.15** «Дачны адказ».
**12.10** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.30** Камедыйная меладрама «Маладыя і шчаслівыя».
**15.00** «Сярэдні клас».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Кодэкс гонару».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**21.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Ганчакі-3: Братэрства народаў».
**23.40** «Позняя гутарка».
**00.20** «Першая кроў».

EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit. Сочы.
**10.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Аргентына. Агляд.
**10.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**11.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**11.45** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Кругавы раўнд. ЗША-Канада. Свіфт-Карэнт.
**14.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Пары. Кароткая праграма. Турын.
**15.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Кароткая праграма. Турын.
**18.45** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Пары. Кароткая праграма. Турын.
**19.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Пары. Адвольная праграма. Турын.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Веласпорт. Чэмпіянат свету па велагонках на трэку. Капенгаген. Дзень 1.
**21.45** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Пары. Адвольная праграма. Турын.
**23.15** Абранае па серадах.
**23.20** Навіны коннага спорту.
**23.25** Абранае па серадах. Госць тыдня.
**23.35** Гольф. Еўрапейскі тур. Турнір Hassan II Trophy.
**00.05** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.10** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.15** «Спартовы курорт». Часопіс.
**00.30** «Прыгоды. Абу-Дабі». Часопіс.
**01.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Кароткая праграма. Турын.
**02.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** На колах.
**17.40** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**18.30** «Загуж – апошні прыпынак», дак. фільм, 2009 г., Польшча–Расія.
**18.45** Невядомая Беларусь: «Слуцкі збройны чын», дак. фільм, 2008 г.
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** Героі не нашага часу: Рамуальд Жолтак: у цісках часу.
**20.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў.
**20.25** Рэпартэр.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Нават не думай», маст. фільм, 2002 г., Расія.
**22.45** Аб'ектыў.

## 25 САКАВІКА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна).
**10.05** Серыял «Агні вялікага горада» (Расія).
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Дзённік «Мінск-Вена-2010».
**12.10** Прэм'ера. Меладрама «Настаўнік музыкі» (Расія).
**13.50** Дак цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Уласнай персонай.
**15.55** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**16.50** Серыял «Агні вялікага горада» (Расія).
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрэсаў.
**19.55** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05** Драматычны серыял «Доктар Хаўс. Чацвёрты сезон» (ЗША).
**23.10** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер.фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**22.05** Прэм'ера. «Сем жонак аднаго халасцяка». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** АНТ прадстаўляе: «Выбар +».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Асабістыя інтэрэс».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Руслан». ЗША-Канада, 2009 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.25** Экспедыцыя.
**11.50** Бітва экстрасэнсаў.
**12.55** Мультсерыял «Галактычны футбол».
**13.20** Пазакласная гадзіна.
**13.35** Жывы гук.
**14.15** Вострасюжэтны дэтэктыў «Зброя» (Расія). 4-я серыя.
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.40** Пасоўванне+.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.15** Калыханка.
**21.30** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.05** Час футболу.
**22.35** Культасвет.
**23.05** Вострасюжэтны дэтэктыў «Зброя» (Расія). 4-я серыя.

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Урокі французскай. Джо Дасэн, Катрын Дэнёў і іншыя». Дак. фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «След саламандры». Расія, 2009 г.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**15.15** Прэм'ера. Тэлесерыял «Суд». Расія, 2009 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «След саламандры». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Двое супраць Фантамаса. Дэ Фюнэс - Кенігсан».
**01.10** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Вочная стаўка».
**09.20** «Асабліва небяспечны!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.20** «Жаночы погляд».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Камедыйная меладрама «Маладыя і шчаслівыя».
**15.00** «Сярэдні клас».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.35** Вострасюжэтны серыял «Кодэкс гонару».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**21.30** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Ганчакі-3: Братэрства народаў».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Алтар Перамогі».
**00.25** «Асабліва небяспечны!».

EUROSPORT

**09.30** «Прыгоды. Абу-Дабі «. Часопіс.
**10.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Кароткая праграма. Турын.
**11.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Пары. Адвольная праграма. Турын.
**12.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Кругавы раўнд. Германія-Японія. Свіфт-Карэнт.
**13.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**14.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Кароткая праграма. Турын.
**15.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Ханты-Мансійск.
**16.45** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Арыгінальная праграма. Турын.
**18.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Кругавы раўнд. ЗША-Швецыя. Свіфт-Карэнт.
**19.30** Веласпорт. Чэмпіянат свету па велагонках на трэку. Капенгаген. Дзень 2.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Веласпорт. Чэмпіянат свету па велагонках на трэку. Капенгаген. Дзень 2.
**22.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Адвольная праграма. Турын.
**23.45** Спартовыя бальныя танцы. Паказальны выступ. Манака.
**01.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Ханты-Мансійск.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Праект «Будучыня».
**17.35** «Шыралі – ноша клопату», маст. фільм, 1986 г., Аўстралія.
**19.05** Асабісты капітал.
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**19.55** Хто ёсць кім?: Барыс Кіт.
**20.15** Форум (ток-шоу): «Дзень Волі», ч. 1.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Невядомая Беларусь: «Эпоха Барадуліна», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**22.05** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял.
**22.50** Аб'ектыў.

## 28 САКАВІКА, НЯДЗЕЛА

**Першы канал**

**07.35** Фільм-казка «Фініст-Ясны сокал» (СССР).
**08.45** Слова Мітрапаліта Філарэта на Свята Увахода Госпадня ў Іерусалім (Вербная Нядзеля).
**09.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.55** У свеце матораў.
**11.25** Nota Bene.
**12.00** Навіны.
**12.10** «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана» (СССР). Фільм «Сабака Баскервіляў». 2-я серыя.
**13.35** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**14.05** «У чаканні Мундыаля». Дзённік чэмпіянату свету па футболе-2010.
**14.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «У гасцях у швецкага караля. Гётэборг».
**16.00** Прэм'ера. Меладрама «Вяселле» (Расія).
**18.00** Суперлато.
**19.00** Навіны.
**19.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.10** Рамантычная камедыя «Мастацтва хораша раставацца» (Францыя).

**АНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00** Нашы навіны.
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Прэм'ера «Шчасце ёсць!».
**12.00** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.35** «Фазэнда».
**13.15** «Разумніцы і разумнікі».
**14.00** Нядзельны «Ералаш».
**14.35** «Песні Перамогі».
**15.05** Прэм'ера. Севастопальскія апавяды.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Фільм «Жыццё ў ружовым колеры».
**18.55** Прэм'ера АНТ: «Давай ажэнімся!».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Міс Беларусь - 2010».
**23.00** «Вялікая розніца».
**00.00** Прэм'ера. Фільм «Некранутасць».

**СТВ**

**07.10** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**08.00** Фільм «Алібі». ЗША-Нідэрланды, 2006г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** «Дарагая перадача».
**13.55** Фільм «Дом, які пабудаваў Свіфт». СССР, 1983 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Прапальнікі жыцця».ЗША, 2006г.
**22.35** Фільм «Чатыры векі кахання». Расія, 2008 г.
**00.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**ЛАД**

**07.15** Дабравест.
**07.40** Мір вашай хаце.
**07.50** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.25** «Елкі-палкі». Кінааповесць (СССР).
**10.00** Школа рамонту.
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.50** Кінаспробы.
**12.10** Бухта капітанаў.
**12.45** «Правы чалавека».
**13.00** Гаспадар.
**13.30** «Беларускі акцэнт». Анатоль Юніцкі (Беларусь).
**14.10** Біятлон. Кубак свету. Змяшаная эстафета. Прамая трансляцыя.
**15.45** Іранічная меладрама «Тэатр» (Канада- ЗША- Вялікабрытанія).
**17.50** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**18.40** Нашы тэсты.
**19.15** Экспедыцыя.
**19.45** Смешная часіна.
**20.20** Тэлебарометр.
**20.40** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Фінал. 4-ы матч.
**22.35** Свая музыка. Працяг.
**23.05** Пасоўванне+.
**23.20** Дэтэктыўны трылер «Гульня на вылет» (Расія).

**РОССИЯ**

**07.00** «Маршал Жукаў».
**08.30** Фільм «Піцерскія вакацыі». Расія, 2009 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Свая чужая сястра».
**14.00** Весткі.
**14.25** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** «Галаўны боль спадара Люмьера». Дакументальны фільм.
**15.40** Фільм «Першае каханне».
**17.10** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.40** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2010.
**23.10** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.15** Фільм «Усё па-сумленнаму». Расія, 2007 г.
**01.55** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**05.55** Камедыя «На колах».
**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.25** «Першая кроў».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «У пошуках Францыі».
**14.10** Фільм «Валер Харламаў. Дадатковы час».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Брудная праца».
**00.00** «Авіятары».
**00.30** «Футбольная ноч».

**EUROSPORT**

**09.30** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Свіфт-Карэнт.1/2 фіналу.
**11.00** Веласпорт. Чэмпіянат свету па велагонках на трэку. Капенгаген. Дзень 5.
**12.15** Аўтаспорт. Гонкі ў класе Турынг. Кубак Еўропы. Эштарыл. Гонка 1.
**12.45** Веласпорт. Чэмпіянат свету па велагонках на трэку. Капенгаген. Дзень 5.
**13.15** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**13.45** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**14.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Порціман. Заезд 1.
**15.00** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Ханты-Мансійск.
**16.00** Веласпорт. Чэмпіянат свету па велагонках на трэку. Капенгаген. Дзень 5.
**16.15** Веласпорт. Велагонка Criterium International. Францыя.
**17.00** Веласпорт. Чэмпіянат свету па велагонках на трэку. Капенгаген. Дзень 5.
**19.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Порціман. Заезд 2.
**19.30** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Порціман.
**20.00** Мотаспартыўны часопіс.
**20.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Паказальны выступ. Турын.
**22.00** Тэніс. Турнір WTA. 3-і круг. Маямі.
**23.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**00.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Свіфт-Карэнт. Фінал.

**БЕЛСАТ tv**

**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.20** «Маскоўская жонка», дак. фільм, 2005 г, Расія–Польшча.
**18.40** Невядомая Беларусь: «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь, ч. 2.
**19.10** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.25** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.35** «Сакрэтная гісторыя архіпелагу ГУЛАГ», дак. фільм, 2008 г., Францыя.
**20.30** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Фільматэка майстроў: «Развязка матчу», маст. фільм, 2005 г., ЗША.

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |

Плательщик

Пеня ________

Кассир Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# ВЕЛАСІПЕДНЫЯ ШПІЁНЫ

Алег ПЯТРОЎ

**Брытанская разведка MI–5 апублікавала былыя сакрэтныя матэрыялы пра кантакты паміж нацысцкай моладзевай арганізацыяй «Гітлерюгенд» і рухам скаўтаў.**




Улетку 1937 года ўся MI–5 стаяла на вушах. Чакаўся прыезд на Альбіён групы сяброў арганізацыі «Гітлерюгенд». Як было напісана ў афіцыйных дакументах, маладыя немцы збіраліся здзейсніць веласіпедны тур па краіне з мэтай вывучэння мовы і сустрэч з аднагодкамі. Аднак у MI–5 амаль ніхто не сумняваўся, што маладыя немцы едуць не з добрымі намерамі. У кулуарах іх так і называлі — «веласіпедныя шпіёны».

У брытанцаў былі падставы для падобных падазрэнняў. Ужо сам профіль арганізацыі гасцей быў занадта палітызаваны. Моладзевая арганізацыя Нацыянал-сацыялістычнай партыі Германіі ўзнікла ў 1926 годзе. У апошнія гады Веймарскай рэспублікі «Гітлерюгенд» адыграў дастаткова вялікую ролю ў эскалацыі гвалту на вуліцах нямецкіх гарадоў. У прыватнасці, арганізаваныя групы маладых нацы нападалі на кінатэатры, дзе дэманстраваўся антываенны фільм «На Заходнім фронце без зменаў». У выніку гэтых нападаў на ўладальнікаў кінатэатраў і гледачоў фільм быў зняты з пракату.

Чыноўнікі не ведалі, што рабіць з экстрэмістамі. У студзені 1930 года бургамістр Гановера забараніў школьнікам уступаць у «Гітлерюгенд». Тое ж зрабілі і ў шэрагу іншых рэгіёнаў краіны. А вось канкурэнты нацыстаў з арганізацыі маладых камуністаў выкарыстоўвалі іншыя сродкі. З 1931 да канца студзеня 1933 года ў сутычках пры выкананні «службовага абавязку ў імя фюрэра» было забіта больш за 20 сяброў «Гітлерюгенд».

Ужо пасля прыходу Гітлера да ўлады, 1 снежня 1936 года, быў прыняты «Закон пра Гітлерюгенд». Удзел у руху стаў абавязковым для ўсіх падлеткаў Германіі.

І вось такія небяспечныя людзі ехалі ў Англію, каб вывучыць англійскую мову! Небяспечныя тым больш (і пра гэта інфармавалі Лондан калегі з Чэхаславакіі), што выкарыстанне веласіпедных тураў у мэтах шпіянажу ўваходзіла ў практыку нямецкай разведкі.

Нямецкія ўлады нават не хавалі, што задачы веласіпедыстаў за мяжой — гэта як мінімум збор інфармацыі. Нямецкі часопіс аматараў веласіпеднага руху тых часоў наступным чынам інструктаваў маладых веласіпедыстаў, якія адпраўляліся ў замежжа: «Намагайцеся запомніць усё, што вы бачыце. Вядзіце дзённік, занатоўвайце назвы рэк, людзей і гор. Калі-небудзь, магчыма, гэта спатрэбіцца вашай радзіме».

Адмовіць у візіце немцам Лондан не мог. Выраршалі зрабіць усё, каб трымаць перасоўванне інтурыстаў пад кантролем. Па ўсяму маршруту іхняга падарожжа паставілі агентаў. Велатурыстам выставілі ўмову загадзя ўзгадняць, што і каго яны хочуць пабачыць.

**Ніякіх канкрэтных вынікаў візіт веласіпедыстаў-шпіёнаў не меў. Як інфармаваў адзін з агентаў MI–5, які тайна прысутнічаў на сустрэчы маладых гітлераўцаў і скаўтаў, падчас гэтых сустрэч моладзь папросту шмат піла віскі**

Цікава, што звычайныя брытанскія грамадзяне нават без інструкцый з боку MI–5 былі вельмі насцярожаныя з'яўленнем на вуліцах гарадоў нямецкіх веласіпедыстаў. У тых жа матэрыялах MI–5 ёсць данясенні звычайных гараджан з інфармацыяй пра падазроных іншаземцаў. Тыя патрыятычныя інфарматары з народу даносілі, што ў немцаў у руках былі… фотакамеры.





Аднак значна больш перапалоху выклікаў той факт, што маладыя нацысты шукаюць кантактаў са скаўтамі. Здавалася, што паміж скаўтамі і нацыстамі не было нічога агульнага. Скаўцкі сусветны юнацкі рух займаўся фізічным, духоўным і разумовым развіццём маладых людзей, каб паспрыяць моладзі заняць канструктыўнае месца ў грамадстве з дапамогай нефармальнай адукацыі, з акцэнтам на практычныя дзеянні на адкрытым паветры — гэта быў вядомы скаўцкі метад. Скаўты прапагандавалі патрыятызм. У выпадку Вялікабрытаніі, яны абвяшчалі сябе прыхільнікамі манарха.

Цяжка сказаць, што зацікавіла нацыстаў у скаўтах. Магчыма, сістэма фізічнай падрыхтоўкі юнакоў з відавочным прыцэлам на вайсковую службу. Магчыма, свой уплыў зрабіў і той факт, што вытокі шэрагу ідэй Гітлера палягалі ў імперскай палітыцы і ідэалогіі Брытаніі, напрыклад, стаўленне да расавага пытання, прынцыпы выхавання і адукацыі эліты і іншыя.

Напярэдадні веласіпеднага туру ў Лондан прыехаў намеснік старшыні «Гітлерюгенд». Мэтай ягонага візіту была сустрэча з заснавальнікам руху скаўтаў былым вайскоўцам, лордам Робертам Бадэн-Паўэлам. Апошні прыняў запрашэнне немцаў і наведаў іх амбасаду. На сустрэчы таксама прысутнічаў тагачасны пасол Германіі ў Вялікабрытаніі Рыбентроп.

Пазней пасол прызнаў, што адной з задач сустрэчы была арганізацыя візіту лідэра скаўтаў да Адольфа Гітлера. Ён, па словах, Рыбентропа, заўсёды быў прыхільнікам сістэмы падрыхтоўкі скаўтаў. Як ні дзіўна, стары лорд застаўся ў захапленні ад сустрэчы.

Зрэшты, лорду таксама падсунулі пернік. Калі ён прыме запрашэнне фюрэра, той адменіць забарону на скаўцкі рух у Германіі, які быў па-за законам у рамках уніфікацыі моладзевага руху пад дахам «Гітлерюгенд».

У лісце, які лорд даслаў праз пару дзён на адрас амбасадара, ён пісаў, што «верыць у будучыя перспектывы кааперацыі моладзі абедзвюх краін».

Інфармацыя пра кантакты Бадэн-Паўэла з немцамі выклікала перапалох у MI–5. Сама ідэя пераходу самай масавай брытанскай моладзевай арганізацыі пад кантроль «карычневых» азначала стварэнне пятай нацысцкай калоны ў краіне. Тым больш, што сам маршал неаднаразова на публіцы даваў зразумець, што сімпатызуе нацыстам у іх барацьбе з камуністамі. «Прачытаў «Майн Кампф». Цудоўная кніга», — пісаў Бадэн-Паўэл у сваім дзённіку. Яго кумірам таксама быў і Мусаліні.

Разведчыкі арганізавалі Бадэн-Паўэл сустрэчу з адным з сяброў ураду, які даў зразумець што ўлады не ў захапленні ад магчымага супрацоўніцтва скаўтаў з гітлераўскай моладдзю. Размова мела свае наступствы. Стары лорд адмовіўся ад сваіх ідэяў наконт візіту ў Трэці рэйх.

Акрамя таго, усім мясцовым скаўцкім групоўкам далі інструкцыі, як паводзіць сябе з сябрамі «Гітлерюгенд». Дзякуючы таму ніякіх канкрэтных вынікаў візіт веласіпедыстаў-шпіёнаў не меў. Як інфармаваў адзін з агентаў MI–5, які тайна прысутнічаў на сустрэчы маладых гітлераўцаў і скаўтаў, падчас гэтых сустрэч моладзь папросту шмат піла віскі. Супрацоўнік MI–5 робіць высновы: шмат выпітага віскі — добры знак таго, што гітлераўцы не змогуць завязаць кантакты з маладымі брытанцамі.

Хутчэй за ўсё, так і было. Пасля распівання моцных напояў з брытанцамі нямецкія спецслужбы прыпынілі спробы працы са скаўтамі. У Берліне было вырашана стварыць у Вялікабрытаніі шпіёнскую сетку з мясцовых нацыстаў і ірландскіх рэспубліканцаў.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Сусед Лукашэнка, які ахвотна аперыруе славянска-савецкай традыцыяй у прагматычных мэтах, ціхай сапай здолеў прасунуцца ў стварэнні беларускай нацыі значна далей. Насуперак папулярнай у нас памылцы, беларусы за 10–15 гадоў прызвычаіліся ўспрымаць сябе як адзіную і самадастатковую нацыю, блізкую, аднак асобную ад Расіі, пры гэтым не надаючы асаблівай увагі праблеме мовы.

**«Країна» (Украіна)**

Пасля з'яўлення Мытнага саюза ўсе расійска-беларускія праблемы перайшлі з плоскасці інтэграцыі двойкай у плоскасць інтэграцыі тройкай, але пры гэтым зусім не змяніліся. Такую выснову можна зрабіць на падставе абмеркавання Мытнага саюза ў канцы мінулага тыдня паміж прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам і прадстаўніком Беларусі ў камісіі Мытнага саюза віцэ-прэм'ерам Андрэем Кабяковым. Прэзідэнт Беларусі яшчэ раз пацвердзіў раней агучаны тэзіс: калі Расія будзе настойваць на тым, што са сферы дзеяння дамовы пра Мытны саюз знікне шэраг некаторых таварных пазіцый, то Мытнага саюза не будзе.

**«Независимая газета» (Расія)**

Зараз на павестцы дня пытанне: што «Газпрам», які набыў 50 працэнтаў Белтрансгаза, будзе рабіць далей? Павялічыць пакет у «Белтрансгазе» да кантрольнага «Газпраму» будзе складана. Гэта стратэгічны актыў, і Лукашэнка будзе адстойваць яго да канца. Не варта забываць, што расійска-беларускія газавыя адносіны не рынкавыя, а міжурадавыя. Тым не менш эксперты не выключаюць, што ў выніку пытанне пра кантроль у «Белтрансгазе» будзе вырашана на карысць Расіі. Варта ўлічыць, што эканамічнае становішча Беларусі цяпер, мякка кажучы, не ідэальна. Так што Лукашэнка цалкам можа зацікавіцца расійскімі прапановамі.

**Газета.ру (Расія)**

Савецкі Саюз паступова аднаўляецца. Доказ таму — прапанова першага віцэ-прэм'ера Ігара Шувалава скасаваць расійскі рубель і ўвесці адзіную валюту для Расіі, Казахстана і Беларусі. У Пуціна неўзабаве будзе шанец забяспечыць лаяльнасць беларускага і казахстанскага рэжымаў: у Лукашэнкі ў наступным годзе заканчваецца прэзідэнцкі тэрмін, а ў 69-гадовага Назарбаева няма відавочнага пераемніка. Магчыма, узамен на фармальную незалежнасць абедзве краіны будуць вымушаны падпарадкоўвацца Крамлю як сябры еўразійскага саюза і паставіць свае нацыянальныя валюты пад кантроль Масквы.

**«The Times» (Вялікабрытанія)**

Рэалізацыю пагрозы санкцый у дачыненні да Мінска беларускія эксперты лічаць малаверагоднай. Еўрапейцы зразумелі, што Лукашэнка водзіць іх за нос, і памахалі яму пальцам. Да прэзідэнцкіх выбараў Брусель яшчэ некалькі разоў памахае пальцам, але да канкрэтных санкцый справа не дойдзе.

**«Комерсант Украины» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ВЕНЕСУЭЛА. РЭКОРД ПА КОЛЬКАСЦІ ЗАБОЙСТВАЎ



Візіт Лукашэнкі да бліжэйшага сябра Уга Чавеса выпаў на дні, калі злачынцы ўсталявалі абсалютны рэкорд па колькасці забойстваў. За мінулыя выходныя ў Венесуэле было забіта 67 чалавек. Такім чынам, Каракас адстаяў славу самага крымінальнага горада ў Лацінскай Амерыцы. Увогуле, у сакавіку ў краіне было забіта 216 чалавек, сярод якіх нават шэраг пракурораў і чыноўнікаў высокага рангу. У мінулым годзе ў краіне ад рук бандытаў памерлі 16 049 чалавек, што значна больш за 2008 год (14 800 ахвяраў). Застаецца дадаць, што галоўны канкурэнт Каракаса ў спаборніцтве за тытул самага крымінальнага горада кантынента — Багата (Калумбія). Тут на 100 тысяч насельніцтва штогод забіваюць 18 чалавек. Аднак да Каракаса Багаце далёка. Аналагічны паказчык у сталіцы Баліварскай рэвалюцыі — 140 чалавек на 100 тысяч.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

### КАЗАХСТАН. ЧЫНГІСХАН БЫЎ КАЗАХАМ



Казахская грамадскасць нечакана пачала кампанію па вызначэнню нацыянальнай прыналежнасці Чынгісхана. На думку шматлікіх мясцовых нацыяналістаў, стваральнік Залатой Арды быў не манголам, а казахам. Доказы? Па-першае, назва групы плямёнаў «манголы» ў эпоху Чынгісхана мела іншы сэнс, чым сучасны. Большасць плямёнаў з асяроддзя Чынгісхана ўвайшлі ў склад казахаў, а не манголаў. Адпаведна, цяперашняя Манголія пры Чынгісхане не была будыйскай, як зараз. Вось такія аргументы, якія афіцыйны Улан-Батар, праўда, не каментуе. Самае цікавае, што казахскім нацыяналістам мала таго, што Чынгісхан быў казахам. Паколькі манголы (чытай казахі) заваявалі старадаўнюю Русь, сучасная Расія, на іх думку, не што іншае, як Казахстан. «Усё адно менталітэт у Расіі мангольскі», — сцвярджаюць прыхільнікі гэтай тэорыі.

**Па матэрыялах радыё «Азалтык» (Казахстан)**

### ГЕРМАНІЯ. САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ АДМАЎЛЯЮЦЦА АД ШРОДЭРА




Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (SPD) імкліва пераглядае спадчыну Герхарда Шродэра — былога канцлера, які навязаў партыі ліберальную эканамічную праграму. Маецца на ўвазе, перш за ўсё, так званы пакет рэформаў Harz. Менавіта гэта праграма каштавала эсдэкам правалу на выбарах у 2005 годзе і цяперашняга катастрафічнага падзення рэйтынгу даверу: з 40 працэнтаў у 1998-м да 20 працэнтаў зараз. Так ці інакш, новыя правадыры эсдэкаў жадаюць як мага хутчэй забыць пра часы Герхарда, які зараз, дарэчы, працуе ў расійскай карпарацыі «Газпром». Нядаўна абраны старшыня партыі Зігмар Габрыель прапанаваў канцэпцыю «Справядлівасць на працоўным рынку», якая фактычна ставіць крыж на ўсіх прапановах Шродэра. Беспрацоўныя, паводле Зігмара, павінны атрымаць як мага больш гарантый. Жоўтая і самая папулярная ў Германіі газета «Bild» назвала прапановы старшыні SPD рэвалюцыяй у сацыял-дэмакратыі.

**Па матэрыялах нямецкай прэсы**

▸ РЭПАРТАЖ

# ГАІЦІ: БЫЛО ДРЭННА,

Алег НОВІКАЎ



Фота аўтара

**Гаіці — краіна, якая толькі-толькі адыходзіць ад наступстваў адной з самых буйных катастроф у гісторыі чалавецтва. Землятрус 11 студзеня гэтага года знёс жыцці каля 250 тысяч чалавек. Праўда, як сведчыць рэпартаж, і без землятрусу на Гаіці праблем хапала.**




## За дзіркай у плоце

Як ні парадаксальна, далёкая і знешне не падобная да Беларусі краіна гістарычна не такая ўжо і чужая беларусам. Пэўным чынам мы таксама прыклалі руку да стварэння першай у свеце дзяржавы былых рабоў, якой стала Гаіці ў 1805 годзе. Каб падавіць паўстанне ў пачатку XIX стагоддзя, Напалеон даслаў у былую французскую калонію корпус, які быў галоўным чынам сфармаваны з рэкрутаў Рэчы Паспалітай. Землякам не пашанцавала: чорных інсургентаў яны разагналі, аднак хутка амаль усе памерлі ад жоўтай ліхаманкі (з 50 тысяч салдат экспедыцыйнага корпусу выжылі толькі 1400).

Страх перад гаіцянскімі хваробамі захаваўся ў іншаземцаў дасюль. У сталіцы Дамініканскай рэспублікі Санта-Дамінга, адкуль мы стартавалі ў падарожжа па Гаіці, інструктавалі — мыць або апрацоўваць рукі пасля кожнага кантакту з гаіцянамі. Для гэтага на мяжы прадаюцца спецыяльныя баначкі мазі.

Праз пяць гадзін мы аказаліся на мяжы. Я адразу згадаў папулярную ў часы СССР кніжку «Там за ракой Аргенціна» славутых чэхаславацкіх журналістаў братоў Мінг, якія аб’ездзілі ўвесь свет. Калі б браты былі не вельмі педантычныя да падбору назваў сваіх твораў, зборнік гаіцянскіх рэпартажаў маглі назваць «Там за дзіркай — Гаіці». Маю на ўвазе дзірку ў металічным плоце, па адзін бок якога Дамініканская рэспубліка, па другі — Гаіці.

Мы тут жа сталі сведкамі забаўнай сцэны: праз згаданую дзірку два чарнаскурых бугаі мэтанакіравана прапіхвалі нейкі цюк з кантрабандай. З боку Дамініканы за працэсам спакойна назіраў памежнік у камуфляжы (было зразумела, што ён з уладальнікамі цюку ў долі). З гаіцянскага боку ніякіх памежнікаў увогуле не было. Таксама, як, дарэчы, мытні і пашпартнага кантролю. Усе, хто жадаў, пралазіў пра дзірку (праўда, для гэтага трэба было дамовіцца з памежнікам). Або, калі хто меў аўто ці матацыкл, ехаў праз вароты. Прычым самае цікавае, што як гаіцянам, так і дамініканцам для візіту ў суседнюю краіну патрэбны візы.

За дзіркай у плоце пачалася экзатычная і легендарная Гаіці. Экзатычная таму, што тут жывуць выключна чарнаскурыя. У адной з першых гаіцянскіх канстытуцый нават было прапісана, што грамадзянінам Гаіці можа быць выключна чалавек з чорнай скурай. Усіх белых тут выразалі як палітычна ненадзейных у час барацьбы за незалежнасць, прычым за адну ноч.

## Быць белым

Быць белым, а тым больш з Беларусі, у краіне кшталту Гаіці — складаная справа. Белую расу тут прадстаўляюць выключна багатыя амерыканцы. Адпаведна, для гаіцян усе іншаземцы — амерыканцы, усе багатыя і могуць нешта падараваць. З іншага боку, знаходжанне ў такім асяроддзі садзейнічае росту еўрапейскай ідэнтыфікацыі кожнага беларуса. Цяжка растлумачыць, што ты з нейкай Беларусі, якая, у сваю чаргу, ёсць былой рэспублікай СССР. Даводзіцца ўвесь час казаць, што ты з Еўропы. Гэта мясцовым больш-менш зразумела.

Легендарная Гаіці таму, што, як было сказана вышэй, яна была першай у свеце краінай, дзе былыя рабы здабылі ўладу. З’яўленне Гаіці на мапе свету ў свой час нарабіла не менш шуму, чым Савецкай Расіі ў 1917 годзе. Тагачасныя заходнія дзяржавы, якія гандлявалі рабамі, былі ў шоку. Яны баяліся, што навіна пра існаванне Гаіці справакуе іхніх нявольнікаў таксама падацца ў рэвалюцыю.

Вынікі таго гаіцянскага чорнага сацыяльнага эксперыменту, праўда, аказаліся вельмі супярэчлівыя. Яшчэ напярэдадні грамадзянскай вайны ў ЗША была створана спецыяльная дабрачынная арганізацыя, якая збіралася выкупаць усіх рабоў у Штатах і адпраўляць іх жыць на вольную Гаіці. Усе прадстаўнікі першай партыі свабодных перасяленцаў папрасіліся назад, шакаваныя памерамі гаіцянскай галечы.

Сёння Гаіці (калісьці самая квітнеючая калонія ў свеце, якая пасля атрымання незалежнасці фінансавала ўвесь антыкаланіяльны рух у Лацінскай Амерыцы) — рэкардсмен па памерах беднасці ў заходняй частцы планеты.

У мясцовай прэсе можна пабачыць цікавыя дэбаты. Некаторыя аўтары ўвогуле прапануюць адмовіцца ад ідэі гаіцянскай дзяржаўнасці і ўсім вярнуцца ў Афрыку, а дакладней, у Сенегал, адкуль галоўным чынам везлі сюды рабоў. Быццам землятрус — гэта быў знак зверху.

## Па той бок плоту

Мы мінулі плот з дзіркай і аказаліся па той бок мяжы. Пачаўся тыповы гаіцянскі пейзаж — з двух бакоў дабітай дарогі бясконцыя шэрагі маленькіх глінабітных дамоў. На тратуарах — перманентны базар. На праезджай частцы — аўтамабільны хаос. Сярод аўтапарку найбольшую цікавасць уяўляюць маршруткі — перарobленыя грузавікі, пафарбаваныя ў яркія колеры. На іх таксама пішуцца розныя лозунгі ў славу Хрыста. Такая заўзятая вера ў Хрыста вельмі незразумелая з улікам папулярнасці культу вуду. У вуду вераць амаль усе. На мясцовым базары я



# СТАЛА ЯШЧЭ ГОРШ





пабачыў куток, дзе прадаюць пеўняў, якія павінны стаць ахвярамі падчас рытуалу вуду.

Не можа не выклікаць цікавасць і своеасаблівая рэклама — як правіла, гэта графіці на платах. Заінтрыгавала рэклама салону тату — як можна на целе чарнаскурага зрабіць татуіроўку?

Пачатак больш шчыльнай забудовы азначае, што мы дасягнулі сталіцы — Порт-о-Прэнс. Не вельмі разумеючы лакальныя фішкі, турыст адразу думае, што вакол наступствы землятрусу — напалову разбураныя дамы, праламаныя платы, шмат смецця.

Але аказваецца, што мы трапілі ў будэнвілі — так называюць бедныя прыгарады, дзе дамы замяняюць нейкія скрынкі. Машыны намагаюцца праскочыць гэтыя раёны як мага хутчэй. Тым больш, што ў выніку землятрусу шмат турмаў у краіне былі разбураныя. Вязні разбегліся і леглі на дно менавіта тут, дзе іх цяжка дастаць паліцыі.

Зараз у Гаіці назіраецца актывізацыя арганізаванага крыміналу. Часам газеты (дарэчы, яны выходзяць рэгулярна) пішуць пра напады бандытаў на канвоі з гуманітарнай дапамогай, напрыклад, на цыстэрны з вадой. Вада тут на вагу золата. Хаця, калі меркаваць па той жа прэсе, галоўным чынам крымінал займаецца тым, што дзеліць тэрыторыю: разбіраецца паміж сабой.

## Сталіца дзяржавы рабоў

Каб пабачыць арэал, які непасрэдна пацярпеў ад землятрусу, трэба ехаць бліжэй да цэнтру сталіцы, якому дасталася больш за ўсё. Сам горад ляжыць на ўзбярэжжы Карыбскага мора на схіле гор. Багатыя кварталы знаходзяцца каля мора, а бедныя вышэй. Дарога ў цэнтр — горны серпанцін. Спускаючыся ў машыне па крутых схілах, атрымліваеш дозу адрэналіну: ніякіх дарожных знакаў тут не існуе. З-за кожнага павароту насустрач раптам можа выскачыць машына.

Наступствы землятрусу праяўляюцца галоўным чынам у вялікіх кучах будаўнічага смецця і друзу, разбураных дамах, у прыціснутымі глыбамі машынах. Напачатку былі яшчэ і трупы, аднак цяпер іх прыбралі. Спрабую ўдакладніць адзін цікавы момант: як пісала заходняя прэса, каб звярнуць увагу на сябе з боку міжнароднай грамадскасці, гаіцяне пачалі блакіравацца трупамі. Цяжка сабе ўявіць барыкады з нябожчыкаў. Гаіцяне кажуць, што гэта лухта. У першыя дні цяжка было знаходзіцца ў горадзе з-за трупнага паху. Усе беглі як мага далей ад гэтага месца. Увогуле, гаіцяне, калі гэта не моладзь, не вельмі любяць узгадваць пра той дзень. Шмат хто згубіў тады родзічаў, дамы. У выніку землятрусу шэраг банкаў абвясцілі сябе банкрутамі. Людзі згубілі ўсё, што назбіралі за шмат гадоў. Дарэчы, мясцовыя жрацы вуду нават забаранілі выкарыстоўваць слова «землятрус». Яны называюць тое, што адбылося 11 студзеня 2010 года, «падзея».

## Наступствы падзеі

У адным з лагераў я сустрэўся з немаладой кабетай. Да 11 студзеня яна 15 гадоў прапрацавала ў нейкім бюро і жыла са сваімі 4 дзецьмі ў аднапакаёвай каморцы без вады і электрычнасці. Цяпер месціцца ў палатцы, аднак на працу можна не хадзіць і жыць за кошт гуманітарнай дапамогі. Здавалася, на Гаіці і так усё было настолькі дрэнна, што горш ужо быць не магло, аднак стала. І гэта больш за ўсё ўражвае.

Не можа не здзівіць адзін архітэктурны феномен: побач з грудай, па якой лазяць марадзёры (усё, што асталася ад будынка), можа стаяць абсалютна цэлы асабняк. Мясцовыя тлумачаць гэта асаблівасцямі тэхналогіі будаўніцтва. Гаіцянскія будаўнікі, як правіла, выкарыстоўвалі для кладкі бетон, куды дадавалі марскую ваду. Канструкцыі ў выніку атрымліваюцца вельмі слабыя. Сапраўды, у цэнтры землятрус спакойна паразіў усе амбасады і прадстаўніцтвы міжнародных арганізацый, пабудаваных замежнымі фірмамі. Цяпер усе мясцовыя палітычныя партыі дружна патрабуюць прыняцця новага закона пра стандарты будаўніцтва.

## Сацыяльная утопія

Цэнтр гаіцянскай сталіцы — своеасаблівая ілюстрацыя магчымасці анархічнай сацыяльнай утопіі. Усе будынкі міністэрстваў, уключаючы прэзідэнцкі палац, разбураныя. Відавочна, што ніякага адміністратыўнага кіравання ў краіне няма, або яно вельмі абмежаванае, перш за ўсё з-за дэфіцыту кадраў і адсутнасці неабходнай камунікацыі паміж ведамствамі. Між тым, жыццё працягваецца. Працуюць банкі, базары, абменнікі, сеткі рэстаранаў хуткага харчавання, нават праводзяцца тыражы нейкага мясцовага лато. На вуліцах, прынамсі ўдзень, не адчуваеш пагрозы.

Усё вяртаецца на свае кругі. Пытаюся ў свайго гіда: якія планы на будучае? Гід — дзяўчынка гадоў 16-ці. Кажа, што планы старыя, чакае, калі зноў пачнуцца заняткі ў яе гімназіі (дарэчы, падчас катастрофы там загінула каля 60 яе аднакурснікаў). Пасля заканчэння будзе намагацца збегчы ў ЗША. Прыкладна 80 працэнтаў выпускнікоў мясцовых ВНУ і гімназій куды-небудзь эмігруюць.

Адносны вакуум улады ставіць цікавае пытанне — якія наступствы будзе мець землятрус для мясцовага палітычнага працэсу? Каб адказаць на яго, трэба згадаць наступствы дыктатуры бацькі і сына Дзювалье і малавядомы ў нас факт. У 2004 годзе ў Гаіці мела месца сапраўдная аранжавая рэвалюцыя.



## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ІЛЬХАМ АЛІЕЎ



Прэзідэнт Азербайджана запісаў на сваіх дзяцей 9 палацаў, набытых у Дубаі (кожны каштуе прыкладна 44 мільёны долараў). Гэта выклікала вялікі скандал. Першай пра цікавую здзелку інфармавала амерыканская прэса, у тым ліку такія салідныя газеты, як «Washington Post». Газету зацікавіла, што шмат аб'ектаў нерухомасці набылі асобы з прозвішчамі і імёнамі дзяцей Аліева. Некаторыя азербайджанскія інтэрнэт-выданні вырашылі, што гэта дае ім магчымасць перадрукаваць інфармацыю, і ў выніку былі сурова пакараныя. Усе іх сайты былі заблакіраваныя. Пад раздачу трапіў таксама сайт азербайджанскай секцыі «Радыё Свабода». На думку аналітыкаў, такая жорсткая рэакцыя была выкліканая тым, што навіну актыўна пачалі каментаваць на форумах. Людзі не саромеліся казаць, што думаюць пра прэзідэнта і ягоных дзяцей. У гэтым, дарэчы, няма нічога дзіўнага: каб набыць нерухомасць, якую займелі Аліевы ў Дубаі, сярэдні азербайджанскі грамадзянін павінен працаваць 10 тысяч гадоў. Між тым, шмат хто звяртае ўвагу на тое, што падобныя пакупкі прэзідэнты і алігархі звычайна афармляюць на падстаўных асобаў, каб не фігураваць на публіцы. Ці не падставіў нехта Ільхама з ягонага атачэння, пытае прэса.

### МУАМАР КАДАФІ



Лідэр лівійскай рэвалюцыі і аўтар «Зялёнай кнігі» з-за кароткатэрміновага арышту свайго сына Ханібала ў Швейцарыі за дарожны інцыдэнт у ліпні мінулага года не толькі абвясціў джыхад швейцарцам. Ён умудрыўся фактычна ўзяць у закладнікі каля 50 іншаземцаў, галоўным чынам супрацоўнікаў швейцарскіх кампаній. Амаль усіх іх арыштавалі на працягу апошняга месяца. Сярод затрыманых таксама грамадзяне Інданезіі, Філіпінаў і шматлікіх краін Еўропы. Звычайна затрыманых падвяргаюць хатняму арышту. Пры гэтым, як сцвярджаюць Amnesty International і Human Rights Watch, урады краін, адкуль паходзяць закладнікі, прынцыпова не жадаюць інфармаваць супольнасць пра арышты. Думаецца, яны маюць надзею на тое, што Кадафі папросту ўкусіла нейкая муха і хутка ён, як кожны сатрап, зменіць гнеў на міласць. Сапраўды, Кадафі — чалавек непрадказальны, які часта мірыўся з былымі ворагамі. Дастаткова ўзгадаць, што зараз Трыпалі падтрымлівае добрыя кантакты з Вялікабрытаніяй, паветраныя сілы якой бамбардзіравалі Лівію ў сярэдзіне 1980-х гадоў.

### МАЙКЛ ФУТ



Апошні рамантык лейбарыстаў памёр на мінулым тыдні. Фут, які нарадзіўся ў 1910 годзе, быў сапраўды вельмі непрагматычным палітыкам. Сям'я Фута — арыстакраты, сябры палаты пэраў. Іншымі словам, Майкл быў наследным лордам. Ён пачынаў як журналіст і актывіст руху супраць атамнай зброі. Як журналіст ён атрымаў нацыянальную папулярнасць. Будучы лідэрам левай апазіцыі ў партыі, ён паступова набіраў пункты. Ягоны зорны час надышоў у 1980 годзе, калі Футу было ўжо 67 гадоў. Майкл узначаліў Партыю лейбарыстаў пасля перамогі Маргарэт Тэтчэр. Насуперак логіцы, партыя Фута замест таго, каб прааналізаваць цікавасць грамадства да правых ідэй, цалкам сышла ў левы радыкалізм. У выніку лейбарысты раскалоліся і атрымалі на выбарах 1983 года самую маленькую колькасць галасоў. Фут падаў у адстаўку, аднак застаўся ў парламенце. Нягледзячы на палітычныя правалы, ён да самай смерці захоўваў імідж рамантыка, які заўзята верыць у лепшае і справядлівае грамадства. Дарэчы, адзін з былых кіраўнікоў КДБ СССР у сярэдзіне 1990-х заявіў, што Фут быў агентам Лубянкі.

ПРАЕКТ

# АЙЧЫНА. НАВУКА. СУМЛЕННЕ

Алесь ГІНЗБУРГ

**14 сакавіка ў Доме-сядзібе Ваньковічаў пры аншлагу адбылася чарговая прэзентацыя праекта «Песні філаматаў і філарэтаў», які ўжо каля года паспяхова існуе ў беларускай культурнай прасторы. Паслухаць канцэрт-лекцыю сабраліся людзі самага рознага веку. Усіх іх аб'яднаў светлы смутак па выбітных дзеячах нашай радзімы. Па тым, што было, і, галоўнае, па тым, што магло быць, але так і не адбылося.**



Аляксей Жбанаў

Творчыя вечары, прысвечаныя філаматам і філарэтам, ладзяцца ў Беларусі так часта, што гэтыя акцыі пачалі нагадваць пасяджэнні напаўмасонскага клуба, рэінкарнацыю таварыстваў філаматаў і філарэтаў у XXI стагоддзі. Гэта адчуванне цалкам адпавядае мэтам праекта «Песні філаматаў і філарэтаў», як іх фармулюе яго галоўны натхняльнік і выканаўца — бард Аляксей Жбанаў: «Сэнс не ў тым, каб самавыявіцца самім, а ў тым, каб надаць голас ім, яркім асобам пачатку XIX стагоддзя». Таму, сцвярджае Аляксей, песні ў праекце чаргуюцца са словамі — аповедам пра тое, як ствараліся навукова-асветніцкія гурткі філаматаў і філарэтаў і чым усё гэта скончылася. Сучасныя маладыя людзі цытуюць вершы Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Тамаша Зана, Аляксандра Адынца, іх лісты адно да аднаго. І, вядома ж, спяваюць — рамансы і балады пра застолле і працу, каханне і сяброўства. Усё, як яно і было ў маладых і адукаваных тады, два стагоддзі таму.

Што характэрна, без гістарычнага экскурсу праект не выглядае поўным, хоць менавіта шанец пачуць «студэнцкія гімны эпохі рамантызму» вабіць на імпрэзы аматараў жывой гісторыі. Да апошняга часу былі вядомыя толькі тэксты песень, складзеных паэтамі Віленскага ўніверсітэта. А што такое песня без музыкі? Даследчыкі стаічна ўстрымліваліся ад слова «графаманія», і запісвалі Чачота ці Зана ў другі шэраг польскіх паэтаў. Усё мяняецца, калі слухаеш тыя ж тэксты ў музычным суправаджэнні і разумееш кантэкст іх стварэння. Удзельнікі праекту бязмежна дзякуюць перакладчыкам, якія ўзнавілі гістарычную справядлівасць, абеларусіўшы напісаныя па-польску песні. Менавіта версіі Кастуся Цвіркі, Васіля Сёмухі і іншых гучаць цяпер у праекце.

Пачалося ўсё ў рэстарацыі «Лідо», выпадкова. Аляксей Жбанаў праспяваў сваю версію «Гімна філаматаў» знаёмым, сярод якіх была музыказнаўца Святлена Немагай, даследчыца беларускай музычнай спадчыны. Падчас працы ў польскіх і літоўскіх архівах Святлена адшукала нотныя запісы вядомых і невядомых песень філаматаў і філарэтаў і апрацавала іх. Пасля сустрэчы з Аляксеем аднавіць песні для сучаснага выканання было ўжо справай тэхнікі. Так філаматы і філарэты наноў набылі голас. Група самых розных музыкаў і спевакоў, якія далучыліся да праекта, працягваюць развучваць партытуры, аднаўляючы твор за творам. У перспектыве — з'яўленне дыску і кнігі з нотамі.

Кастусь Цвірка, укладальнік кнігі «Філаматы і філарэты», якая пабачыла свет у 1998 годзе ў выдавецтве «Беларусі кнігазбор», таксама далучыўся да выступоўцаў. Падхапіўшы ноту імпрэзы, Цвірка працягнуў распавед пра віленскіх студэнтаў так, нібы ведаў іх асабіста: «Калі я слухаю, як гэта моладзь спявае песні той моладзі, мне здаецца, яны зноў з намі», — падсумаваў ён. Эфект прысутнасці філаматаў ды філарэтаў у доме Ваньковічаў, дарэчы, не быў ім перабольшаны.

Падчас канцэрту-лекцыі песні выконваліся ў храналагічным парадку з тумачэннямі, як і чаму песня была напісаная. Жбанаў казаў пра нацыянальных герояў Рэчы Паспалітай «хлопцы» і далікатна выбіраў выразы, якія максімальна збліжаюць іх дзейнасць з тым, што займае сучасных адукаваных людзей: маёўкі, музычныя салоны, вечарынкі, этнаграфічныя вандроўкі, культурна-асветніцкія праекты, выданне часопісаў — усё гэта існавала ўжо тады. Калі апавядальнік перайшоў да арышту і зняволення сябраў таварыства — у залі запала ціша. У тым, як падаецца храналогія бязглуздых рэпрэсій, не было злобы — адно сумная іронія: нехта ў залі асцярожна намякнуў, што яму вельмі знаёмыя пачуцці рэпрэсаванай шляхты да царскай улады. Уражвае падрабязнасць: Тамаш Зан і Ян Чачот узялі ўсю «віну» на сябе, за што былі сасланыя ў Сярэднюю Азію. Таму большасць удзельнікаў таемных таварыстваў, як, напрыклад, мастак Валянцін Ваньковіч (ён быў блізкім сябрам многіх удзельнікаў забароненых сходак), увогуле не пацярпелі. З Беларусі было выслана 10 філаматаў і 10 філарэтаў. Іх лёсамі ў эміграцыі завяршаецца музычны аповед.

Праект «Песні філаматаў і філарэтаў» інтэрактыўны: гледачы атрымліваюць словы песняў і могуць пры жаданні спяваць разам з выканаўцамі. Напачатку і напрыканцы сустрэчы традыцыйна гучыць гімн «Хай радасць з вачэй нашых блісне...». Падчас яго выканання разумееш: мае месца нешта большае, чым канцэрт у рамантычных дэкарацыях. Праект «Песні філаматаў і філарэтаў» варта прапісваць сённяшнім студэнтам як комплекс вітамінаў, здольны вярнуць у беларускія ВНУ дух братэрства ды любові да навукі і айчыны.




Гэту песню Адама Міцкевіча, у беларускім перакладзе Кастуся Цвіркі, прыхільнікі праекту «Песні філаматаў і філарэтаў» спяваюць стоячы, як беларускі «Gaudeamus...»

Хай радасць з вачэй нашых блісне
І ўвенчыцца лаўрамі голаў!
Далонь даланю моцна сцісне.
Зноў разам мы! Наша тут кола.

Не возьмем мы хцівасць ва ўжытак,
Прэч, сквапнасці, пыхі насенне!
Наш самы высокі набытак —
Айчына, навука, сумленне.

Гэй, скінем жа з сэрца ўсе путы,
Брат брату душу хай раскрые.
З нас кожны — свабодны, раскуты.
Нам словы братэрства — святыя!

У спевах, у келіхаў звоне
Развеюцца сэрца пакуты.
За плугам хай ты ці на троне
Адно помні — нашы Статуты!

Прысягу сяброўскую помні,
Няхай кожны дзень і імгненне
Табе свецяць словы, як промні,
Айчына, навука, сумленне!

Хаця і не простай дарогай
Мы дойдзем да сіняга рання.
Нам будзе тут неба падмогай,
І мужнасць, і наша яднанне!

**1819**

## Хто такія філаматы і філарэты?

У верасні 1817 года студэнты Віленскага ўніверсітэта, дзе вучылася пераважна беларуская шляхоцкая моладзь, утварылі таемнае згуртаванне, якое назвалі Таварыства філаматаў (у перакладзе з грэчаскай мовы — аматараў навук). У яго ўвайшлі самыя таленавітыя маладыя людзі, імёны якіх сталі потым шырока вядомыя ў свеце. Гэта паэт з сусветным імем Адам Міцкевіч, пачынальнік новай беларускай літаратуры і фальклярыст Ян Чачот, таленавіты паэт і грамадскі дзеяч Тамаш Зан, дзекабрыст Міхал Рукевіч, паэт і рэвалюцыянер Анупрэй Петрашкевіч, вялікі вучоны і асветнік, нацыянальны герой Чылі Ігнат Дамейка, вучоны-арыенталіст, заснавальнік манголазнаўства ў Расіі Язэп Кавалеўскі, дырэктар Літоўскай метрыкі ў Пецярбурзе Францішак Малеўскі ды іншыя. Амаль усе філаматы былі з беларускіх губерняў. Адзіны «не-ліцвін» быў старшыня Таварыства філаматаў Язэп Яжоўскі, родам з Украіны.

Галоўная мэта, якую ставілі перад сабой філаматы, — асвета роднага краю. Яны вывучалі прыроду, гаспадарку, этнаграфію, фальклор, мову Беларусі і прылеглых земляў, дзеля гэтага склалі і выдалі спецыяльную інструкцыю «Геаграфічнае апісанне». Філаматы пачалі нават пісаць падручнікі па розных галінах навукі для школ, рыхтавалі выданне часопіса «Геба». Свае творы яны пісалі пераважна на тагачаснай літаратурнай мове Беларусі — польскай. Але ставілі задачу, як прызнаюць і польскія даследнікі, «збіраць песні і паданні народа і пісаць па-беларуску». Тут асабліва праявіў сябе Ян Чачот, беларускія песні якога — «Да пакіньце горла драць», «Што мы вашэці скажам» ды іншыя — выконваліся на ўсіх філамацкіх сходках і ўрачыстасцях.

Для пашырэння свайго ўплыву на грамадства філаматы ўтварылі розныя філіі. Асабліва шырокі рэзананс атрымала дзейнасць арганізаванага Тамашом Занам Таварыства прамяністых, якое потым пераўтварылася ў Таварыства філарэтаў (аматараў дабрадзейнасці).



Патрыятычная дзейнасць філаматаў, якіх можна з поўным правам назваць пачынальнікамі ліцвінскага (беларускага) нацыянальнага адраджэння, была перапынена ў 1823 годзе з выкрыццём таварыства. Большыня філаматаў і філарэтаў трапіла ў турму, найбольш актыўныя з іх былі высланыя з роднай зямлі ў глыбіню Расіі. Але і пасля гэтага яны працягвалі змаганне. Напрыклад, ацалелы ад рэпрэсіяў Міхал Рукевіч арганізаваў на сваёй Беласточчыне сярод афіцэраў Літоўскага корпуса царскай арміі згуртаванне «Вайсковыя сябры», якое ў віхурыстым снежні 1825 года мужна выступіла ў падтрымку паўстання на Сенацкай плошчы Пецярбурга.

**150 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. Мінск, 1999**

ІНТРЫГІ

# УДАЧА ЯНА КАЗІМІРА САПЕГІ

Кастусь ТАРАСАЎ

**У сакавіку 1726 года гетман Сапега з сынам Пятром прыбыў у Пецярбург да Кацярыны І і Меншыкава па асабістай справе. Але пра такую вялікую ўдачу, якая зваліцца на яго, ён і марыць не мог.**


Аляксандр Меншыкаў


Марыя Меншыкава


Ян Казімір Сапега (старэйшы)


Кацярына І (Марта Скаўронская)

## Спадчына Скаўронаў

Да вайны ў Мінску на тым месцы, дзе зараз узвышаецца Палац Рэспублікі, стаяў каменны дом, пабудаваны ў XVII стагоддзі. У флігелі пражываў слуга ваяводы Сапегі ліцвін Сямён Скаўрон. У сярэдзіне 1680-х гадоў ён уцёк у Эстляндыю.

У Скаўронаў было пяцёра дзяцей — два сына і тры дочкі. Смерць бацькоў ад чумы пакінула іх сіротамі, і дзяцей разабралі суседзі. Карл заняўся сельскай гаспадаркай, Фёдар служыў фурманам, Хрысціну выдалі замуж за прыгоннага. Марту выхаваў лютэранскі пастар па прозвішчу Глюк. Гэты асветнік перавёў Біблію на рускую мову, аднак не навучыў Марту грамаце. Добразычлівасць Марты да моцнага полу падказала Глюку выдаць 16-гадовую выхаванку замуж.

Падчас Паўночнай вайны муж загінуў, а Марта пры ўзяцці Нарвы рускімі ў 1702 годзе дасталася ў якасці трафея унтэр-афіцэру. Затым ліцвінкай зацікавіўся фельдмаршал Шараметьеў, у 1703 годзе яе ўзяў да сабе Меншыкаў, а праз год Марту ўбачыў Пётр І. Яна яму спадабалася і праз некаторы час стала яго жонкай і імператрыцай Кацярынай І.

## Сапегі

Гісторыя Марты Скаўрон была б меней цікавай, калі б у ёй не прынялі ўдзел Сапегі. Яшчэ ў 1633 годзе Станіслаў Сапега выбіў для сябе ў імператара Фердынанда ІІІ тытул князя Рымскай імперыі. У 1700 годзе стараннямі Міхала Сапегі права тытулавацца князямі распаўсюдзілася на ўвесь род, які паходзіў з полацкіх баяраў. У гэты час бацька яго, Ян Казімір Сапега, быў гетманам вялікім літоўскім і віленскім ваяводам, яго дзядзька Бенедыкт трымаў пасаду падскарбія. Такім чынам, казна Вялікага княства захоўвалася ў Сапегаў.

Усё гэта раздражняла магнатаў, якія супернічалі з Сапегамі, і яшчэ ў 1696 годзе ўтварылася антысапегаўская канфедэрацыя шляхты. Гетман Сапега ўзяў у асаду войска канфедэратаў у Брэсце і вымусіў да перамоў. Праз два гады сын гетмана, Міхал Сапега, разбіў войска канфедэратаў пад Юрборкам. У адказ стварылася новая канфедэрацыя, так званыя «рэспубліканцы» (абаронцы «вольнасцяў шляхты» супраць «тыраніі» Сапегаў), якую ўзначаліў Міхал Кацёл.

Нядзіўна, што гетман і падскарбій апынуліся на боку шведскага караля Карла XII. «Рэспубліканцы» для выратавання жыцця і маёмасці ад мсціўцаў, узмоцненых войскамі «лютэраў», пацягнуліся пад рускае крыло.

Ян Казімір Сапега апынуўся супернікам Пятра аж да выхаду ў 1712 годзе расійскіх войскаў з беларускай зямлі. У той час яму нават прысніцца не магло, што ён стане расійскім фельдмаршалам і генерал-губернатарам Пецярбурга.

## Здрада Кацярыны І

У 1708 годзе ў Кацярыны нарадзілася дачка Ганна, у 1709-м — Елізавета. Кацярына спадарожнічала Пятру ў паходах, у тым ліку ў няўдалым Прутскім, калі ўлетку 1711 года Пётр выступіў супраць султана. У ноч на 10 ліпеня туркі сабралі каля вёскі Станілешты 200 тысяч войскаў, абвялі рускі лагер акопамі і пабудавалі батарэі на вышынях. Усведамляючы безнадзейнасць становішча, Пётр напісаў ліст сенату, у якім распарадзіўся, што ў выпадку, калі ён патрапіць у палон да туркаў, не лічыць яго больш гасударам.

Кацярына сабрала ў афіцэраў усе іх каштоўнасці, дадала да іх свае і царскія і паехала ў лагер да турэцкага пашы. Адсутнічала яна ноч, а калі на наступную раніцу вярнулася, туркі знялі аблогу і пагадзіліся на мірную дамову: Расія вяртала Турцыі Азоў, Пётр таксама абавязваўся не ўмешвацца ў справы Рэчы Паспалітай. Вярнуўшыся з паходу, Пётр ажаніўся з Кацярынай, а іх дочкі атрымалі афіцыйны статус вялікіх княгінь.

7 мая 1724 года ва Успенскім саборы Крамля Пётр усклаў на жонку імператарскую карону. Адным з чыннікаў каранавання была адсутнасць спадчынніка. Пётр вырашыў перадаць пасад Кацярыне, хаця наўрад ці меў ілюзіі наконт яе дзяржаўных здольнасцяў.

У лістападзе Пётр перажыў трагедыю. Быў арыштаваны Вільям Монс — улюбёнец Кацярыны, кіраўнік яе канцыляріі, родны брат былой палюбоўніцы цара Ганны Монс. Пётр не прабачыў яму сужыцельства з Кацярынай. Вільяму давялося пакласці галаву на плаху. Галаву яму адсеклі з аднаго ўдару, дый тое не па загадзе цара, а па літасці ката, які сімпатызаваў ахвяры. Адсечаную галаву Монса змясцілі ў слоік са спіртам, і Пётр паставіў яе «для любавання» ў пакоі жонкі. Таксама Пётр загадаў апячатаць каштоўнасці жонкі і забараніў выконваць яе загады. А галоўнае — знішчыў падрыхтаваны акт аб прызначэнні яе спадчынніцай.

Калі ў студзені 1725 года імператар паміраў, Меншыкаў здолеў настолькі ізаляваць Пятра, што ніякае яго распараджэнне на шкоду Кацярыне не магло быць пачутым. З апошнім уздыхам цара камандзір Сямёнаўскага палка вывеў гвардзейскія палкі на плошчу і абвясціў усім, што «волі імператрыцы з гэтага часу павінны падпарадкоўвацца ўсе падданыя незалежна ад чыноў і рангаў».

Адбыўшы кароткую жалобу, імператрыца пачала забаўляцца — фаварыты, уборы, шпацыры ў летняй рэзідэнцыі, застольныя «трактаванні», знакамітыя «асамблеі» хутка ператварыліся ў разгульныя вечарынкі. За інтымныя заслугі з камер-юнкераў у графы быў узняты яе фаварыт з лейб-гвардзейцаў Рэйнгольд Левенвольдэ.

## Графы Скаўронскія

Пры жыцці Пятра сваякоў Кацярыны трымалі далёка ад двара. Толькі Фёдар ледзьве выбіўся ў людзі — служыў фурманам на паштовай станцыі. Заняўшы па смерці мужа трон, Кацярына І успомніла пра братоў і сёстраў. Усе былі дастаўленыя ў Пецярбург і змешчаныя на Стрэльніцкай мызе побач з Гатчынай. Тут браты і сёстры прайшлі «курс свецкай адукацыі». А ў 1727 годзе сям'я, з якой паходзілі сваякі імператрыцы (браты Карл і Фёдар, сёстры Ганна і Хрысціна), атрымала графскі тытул. «Акультурылася» і прозвішча. «Скаўронскія» гучала больш высакародна, чым «Скаўроны».

Усім Скаўронскім былі падараваныя маёнткі ў Цвярской губерні. Нечаканага шчасця не вынес Фёдар — у сваім новым маёнтку граф запаў у непрабудны запой і пакінуў гэты свет, не прыходзячы ў прытомнасць. Адзін з самых старажытных маёнткаў на Разаншчыне — Азярцы — у 1727 годзе дастаўся графу Карлу Сямёнавічу Скаўронскаму і належаў яго нашчадкам больш за 100 гадоў.

З Ганнай, сястрой Кацярыны, ажаніўся Міхась Ефімоўскі. Сыны іх Іван і Андрэй у 1742 годзе атрымалі графскія тытулы.

Хрысціну Скаўронскую (1687–1729), малодшую сястру імператрыцы, абвянчалі з Сымонам Гендрыкавым. Чацвёра іх дзяцей у 1742-м таксама былі ўзняты ў графскую годнасць.

Дачку Карла Скаўронскага Ганну выдалі замуж за Міхаіла Варанцова.

Пра малодшую з дачок Карла — Соф'ю — будзе сказана асоба.

## Фельдмаршал Сапега

Ян Казімір Сапега, які прымаў удзел у Паўночнай вайне на баку Карла XII, у 1720 годзе ўступіў у перамовы з Меншыкавым наконт жаніцьбы свайго сына Пятра на яго дачцэ, за што абяцаў падтрымаць кандыдатуру Меншыкава ў курляндскія герцагі. У Пецярбург ён прыбыў у 1726 годзе і тут жа атрымаў ад імператрыцы ў падарунак багатыя маёнткі. Чуткі тлумачылі такую шчодрасць Кацярыны І тым, што Сапега дапамог ёй адшукаць сваякоў.

А акрамя таго, Ян Казімір атрымаў жазло генерал-фельдмаршала і стаў адзіным замежным носьбітам гэтага высокага звання. Беспрэцэдэнтны выпадак у Расійскай імперыі, калі былы супернік, які нанёс дзве паразы рускім войскам, быў узнесены да чыну фельдмаршала. І ў дадатак яшчэ стаў кавалерам вышэйшага расійскага ордэна — святога апостала Андрэя Першазванага.

Кацярына прысутнічала на заручынах князёўны Марыі Меншыкавай з Пятром Сапегам. Меншыкаў абвясціў, што дае ў пасаг за дачкой 87 тысяч рублёў. Імператрыца падарыла князёўне 100 тысяч рублёў і некалькі вёсак. Фельдмаршал Сапега святкаваў.

Такая міласць Кацярыны мела істотную для яе прычыну. Сваім новым фаварытам яна абрала сына фельдмаршала — Пятра Сапегу, заручыны якога не прапусціла. Свайго сардэчнага сябра Кацярына ўзвяла ў званне сапраўднага камергера, узнагародзіла ордэнам Аляксандра Неўскага, падаравала яму маёнткі і свой партрэт, упрыгожаны дыяментамі, для нашэння на блакітнай стужцы. Імператрыцы было 43 гады, ёй заставалася жыць месяц.

**Свайго сардэчнага сябра Кацярына ўзвяла ў званне сапраўднага камергера, узнагародзіла ордэнам Аляксандра Неўскага, падаравала яму маёнткі і свой партрэт, упрыгожаны дыяментамі, для нашэння на блакітнай стужцы**

Прадчуваючы блізкі канец, яна абвясціла спадчыннікам 12-гадовага Пятра Аляксеевіча. Меншыкаў дамогся ад яе згоды на шлюб сваёй дачкі Марыі са спадчыннікам трона. Заручыны з Пятром Сапегам былі разарваныя, і князёўна Марыя заручылася з непаўналетнім яшчэ Пятром ІІ. Малалетні імператар узвёў Меншыкава ў званне генералісімуса.

Аднак яго супернікі склалі змову, і генералісімус апынуўся пад хатнім арыштам. Адных толькі дыяментаў і каштоўнасцяў у яго канфіскавалі на мільён рублёў. Прысудам, зацверджаным Вярхоўнай таемнай радай, яму была прызначана высылка — горад Бярозаў у Сібіры. Там Меншыкаў у 1729 годзе і памёр.

## Пётр Сапега і Соф'я Скаўрон

У апошні месяц жыцця Кацярыны ў Пецярбург прымчаўся Ян Сапега, устрывожаны няўдачай заручын. Імператрыца пагадзілася аддаць у жонкі свайму фаварыту родную пляменніцу, графіню Соф'ю Скаўронскую. Яна атрымала ў пасаг 70 тысяч рублёў і некалькі вёсак у Расіі і Лівоніі.

Пётр Сапега не лічыў трывалым сваё становішча ў Расіі, ён прадаў маёнткі і з'ехаў на радзіму, маючы пры сабе два мільёны срэбных рублёў. Жонка яго Соф'я нарадзіла ў 1734 годзе сына, названага ў гонар дзеда Янам.

Ян Казімір Сапега ў 1727 годзе ў дадатак да «баявога звання» і вялізнага пансіёна быў прызначаны Санкт-Пецярбургскім генерал-губернатарам. Аднак службай у расійскай сталіцы не зацікавіўся і з'ехаў у свой маёнтак. У роднай сядзібе ён мог з задавальненнем успамінаць жаніцьбу сына на графіні Скаўронскай, два мільёна рублёў з расійскага скарбу, а таксама свае бітвы з рускімі і атрыманне з рук імператрыцы чына расійскага генерала-фельдмаршала.

МОВА

# ТРЭЦЯЯ АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНАЯ ДЫКТОЎКА



Аляксей ХАДЫКА

**Тры гады запар у сімвалічныя дні, калі зіма мяняецца на вясну, — 21 лютага, у Міжнародны дзень роднай мовы, 15 сакавіка, у гадавіну беларускай Канстытуцыі, якая 20 гадоў таму зацвердзіла за беларускай мовай статус адзінай дзяржаўнай, і 25 сакавіка, на ўгодкі абвяшчэння БНР, — дарослыя людзі сядаюць пісаць дыктоўку.**

Гэтым разам 15 сакавіка 2010 года ў сядзібе Таварыства беларускай мовы на вуліцы Румянцава, 13 у Мінску тых, хто пісаў тэкст, было роўна столькі, колькі месцаў за вялікім сталом у памяшканні, — тузін.

Яны занатоўвалі ўрывак з Караткевіча — шчырае прызнанне ў любові да Радзімы: «Я хачу правесці вас па зямлі, якая для мяне — даражэй за ўсё, самы ўтульны і чароўны кут...»

Лічба ўдзельнікаў сімвалічная — дванаццаць апосталаў калісьці панеслі па свеце вучэнне Хрыста, каб зрабіць яго неўміручым.

«Калі дыктоўку пішуць адзін раз — гэта выпадковасць, калі два — гэта не так доўга, калі тры — гэта ўжо традыцыя. Беларусы ўсяго свету паказалі, што ім патрэбная гэта дыктоўка», — заўважыў Алег Трусаў, старшыня ТБМ, арганізацыі, якая колішнюю ініцыятыву Уладзіміра Падгола ператварыла ў эмацыйную дэманстрацыю вернасці роднаму слову.

Сімвалічная маніфестацыя адданасці нацыянальнай культуры пачала самастойнае існаванне, пайшла ў народ, пашырылася ў краіне і за яе межамі. Са сталіцы дыктоўка перасунулася ў мястэчкі і вёскі, у клубы, грамадскія аб'яднанні, школы. 200 простых палешукоў напісалі дыктоўку толькі ў гэтым годзе. Культурна-асветны клуб «Спадчына» правёў яе ў Старадарожскім раёне. Далучылася моладзь у Мінску. Тэлевізійная кампанія «Белсат» прапанавала ўдзельнікам дыктоўкі прызы. Ініцыятыва выйшла за межы краіны. За сталы сядалі беларускія эмігранты і прыхільнікі нашай культуры ў Польшчы, Англіі, ЗША, Чэхіі, Аўстраліі.

Удзел у дыктоўках бралі амбасадары Украіны Ігар Ліхавы і Швецыі Стэфан Эрыксан, дэкларавала сваё жаданне далучыцца да акцыі ў падтрымку беларускай культуры пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі.

Час глабалізацыі змушае неабыякавых да роднага слова людзей шукаць шляхі выяўлення сваёй вернасці мове. Падобныя дыктоўкі пішуць літоўцы, палякі, французы. Беларусам, якія мову ў штодзённым жыцці амаль страцілі, нельга губляць шанс сказаць пра сваё права быць на гэтай зямлі. Алег Трусаў можа падавацца летуценным аптымістам, але ён абяцае: на дзесяціх ўгодкі ініцыятывы, у 2018 годзе, дыктоўку будзе пісаць уся краіна.

Тым, хто жадае далучыцца, паведамім: ніводны настаўнік ці супрацоўнік якой-кольвек дзяржаўнай арганізацыі за ўдзел у ініцыятыве не пацярпеў. Дыктоўка — абсалютна станоўчы чын, які яднае ўсіх беларусаў. І кожнаму дае шанс быць апосталам, пасланнікам, вучнем, як тыя дванаццаць, што прыйшлі ў ТБМ 15 сакавіка 2010 года. Ці зробім крок у будучыню, беларусы?

ВЫСТАВА

# ВАВІЛОНСКАЯ ВЕЖА

Аляксей ХАДЫКА

**Колькі гадоў таму, намаляваўшы партрэт банкіра краіны Марыі Віннікавай у крэсле са зламанай ножкай, мастак Віктар Альшэўскі нечакана зрабіўся аб'ектам свецкіх пагалосак: адкуль жывапісец ведаў і як прадбачыў лёс чыноўніцы, што ў хуткім часе трапіла пад крымінальны пераслед?**



Звяртаючыся да вобразаў суайчыннікаў, мастак-партрэтыст так ці інакш выяўляе гісторыю ўласнай краіны — праз лёсы людзей, якія пакідаюць у ёй свой след. Але Віктар Альшэўскі — не толькі партрэтыст.

11 сакавіка 2010 года ў Нацыянальным мастацкім музеі адкрылася выстава яго жывапісных работ «Фрагменты Вавілонскай вежы», якая зрабілася ўзорам не вельмі шматлікіх канцэптуальна падрыхтаваных экспазіцый. Яна працягнула прадстаўлены мастаком у мінулым годзе праект «Легенды нашай цывілізацыі». Ён экспанаваўся ў Мінску і шэрагу гарадоў Магілёўшчыны, а закранаў легендарныя сюжэты з гісторыі гарадоў Беларусі і сусветнай культуры.

Уласна, тэма асобы на фоне і ў кантэксце вялікіх падзей гістарычнага часу — скразны стрыжань творчасці Альшэўскага. Яшчэ дваццаць год таму ён увайшоў у склад адной з першых нефармальных мастацкіх груповак Беларусі, «Няміга–17», кожны з жывапісцаў якой вызначаўся яскравым асабістым стылем — Мікола Селяшчук, Сяргей Кірушчанка, Мікола Бушчык і іншыя.

Кожны — імя ў сучасным мастацтве. Нехта з групоўкі эксперыментаваў з колерам, нехта шукаў новыя формы, а Альшэўскі вызначыўся найбольшай схільнасцю да сімвалічна-знакавай трактоўкі сюжэту і сэнсава-літаратурнай напоўненасці кампазіцый. Апрача партрэтаў — беларуская гісторыя XX стагоддзя, чарнобыльская тэма. Яго палатно «Бяда» — ці не самае шчымлівае выяўленне той трагедыі ў нашым жывапісе. Купка перасяленцаў з зоны, а разам з людзьмі — рэчы-знакі: спынены гадзіннік, пустое люстэрка, у якім зніклі адлюстраванні.

Стылістыка прац Віктара Альшэўскага, мастака-манументаліста па адукацыі, вучня Гаўрыіла Вашчанкі і Міхаіла Савіцкага, заснаваная на эстэтыцы вялікіх яркіх колеравых паверхняў і спалучэнні рэалістычных вобразаў з каментуючымі дэталямі. У партрэце гэта нараджае «неасармацкую» вобразнасць — чалавек паўстае побач з прадметамі, праз якія выяўляецца яго лёс. На выставе гэта выявы былога дырэктара Мастацкага музея Юрыя Карачуна, народнага артыста Валянціна Елізар'ева, акадэміка Міхаіла Высоцкага і іншых.

Але галоўная тэма экспазіцыі — знакі старажытных культур і сучаснасць. І абагульняе тэму паліптых «Фрагменты вавілонскай вежы» — вобраз альтэрнатывы марнаму імкненню да багаароўнасці, увасоблены ў помніках чалавечай культуры і духу. Падзеленае моцнымі бар'ерамі, чалавецтва яднаецца імкненнем да прыгажосці ў творчасці. На 13 фрагментах «вежы» — манументы старажытнага Усходу, антычнасці, еўрапейскага Рэнесансу, сярод якіх у сумоў'і культур Беларусь рэпрэзентуецца мурамі Мірскага замку. Людзі і праца іх генія — так будуецца Вавілонская вежа Альшэўскага.

З НАГОДЫ

# «НАШАМУ СЛОВУ» — 20 ГАДОЎ

Алег ТРУСАЎ, старшыня ТБМ

**17 сакавіка 1990 года пабачыў святло першы нумар газеты Таварыства беларускай мовы «Наша слова».**

Спачатку гэта быў штомесячны бюлетэнь, заснаваны першым кіраўніком ТБМ Нілам Гілевічам. Але ўжо праз год газета пачала выходзіць штотыднёва, прадавацца ў шапіках і атрымала права на падпіску.

У складзе рэдакцыі пад кіраўніцтвам вядомага беларускага пісьменніка і журналіста Эрнэста Ялугіна працавала больш дзесяці чалавек, аб'ём выдання — ад 8 да 12 старонак, а наклад дасягаў 20 тысяч асобнікаў. Газета мела дзяржаўную фінансавую падтрымку і выходзіла ў Мінску.

Пасля рэферэндуму 1995 года сітуацыя значна пагоршылася, і дзяржаўнае фінансаванне газеты напрыканцы 1996 года спынілася. Яе існаванне апынулася пад пагрозай, і некалькі месяцаў газета не выходзіла. У гэты ж час вырашаўся лёс і самой арганізацыі ТБМ.

Аднак дзякуючы намаганням новага кіраўніцтва ТБМ, якое ўзначаліў Генадзь Бураўкін, Таварыства беларускай мовы выстаяла. Паўстала пытанне пра аднаўленне дзейнасці газеты без усялякай дзяржаўнай падтрымкі, выключна на грамадскіх пачатках.

У гэты няпросты час адказнасць за лёс выдання ўзяў на сябе былы афіцэр, падпалкоўнік, шчыры беларускі патрыёт, што паходзіць з нясвіжскай вясковай шляхты, — Станіслаў Суднік.

З восені 1997 года «Наша слова» выходзіць у горадзе Ліда, дзе жыве і працуе яе нязменны выдавец і рэдактар. Газета выходзіць толькі на грамадскіх пачатках, не маючы ганарараў для аўтараў і заробкаў для рэдактара і журналістаў. Тым не менш, мае свой адметны твар і добра вядомая як на Беларусі, так і за яе межамі.

Падрабязную інфармацыю пра гісторыю газеты можна прачытаць у юбілейным нумары ад 16 сакавіка гэтага года.

Хочацца пажадаць «Нашаму слову» новых чытачоў і асабліва новых сталых падпісчыкаў.

***

Журналісты «Новага часу» далучаюцца да віншаванняў.

Дарагія калегі, вы ўжо переможцы, бо выстаялі і выходзіце ў надзвычай неспрыяльных умовах. Ваша свабоднае слова працуе на Беларусь — вольную, незалежную, дэмакратычную і заможную.

Поспехаў вам і развіцця!

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 242
Падпісана да друку 19.03.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.